БССР з гонарам выканала свае абавязкі перад пралетарамі гораду Леніна

Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

ЛІСТАПАД 29 1932 г. № 266 (4518)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—Узброіць ведамі, загартаваць на рабоце кандыдата партыі. **САМУСЕВІЧ** — Сацыялістычнай сьвінагадоўлі—уласную кармовую базу (3 стар).
САВІЦКІ, ПРАКАПЧУК—Безалькалёідны любін (3 стар.).
КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ: Белбудаб'яднаньне мяркуе... (2 стар.).
Ленінграду адгружана 191.000 тон бульбы (1 стар.).
Канкрэтнае кіраўніцтва ільнаапрацоўкай падмяняецца рэзалюцыямі (1 стар.).
Змагацца за сваячасовае паступленьне ўсіх плацяжоў па кожным раёне і сельсавету (2 стар.).
Перавыбары спажывецкай сыстэмы пераварыць у масавую праверку рэалізацыі ды рэктыў аб разгортваньні савецкага гандлю (2 стар.).
Прэч фашысцкі тэрор—напярэдадні працэсу Тарашкевіча (4 стар.).
ЗА МЯЖОЙ:
Польшча ратыфікавала савецка-польскі пакт аб ненападзе (1 стар.).
Праект стварэньня ўраду «моцнай рукі» (1 стар.).

Узброіць ведамі, загартаваць на рабоце кандыдата партыі

Няўхільны рост нашай партыі — найбольш яркі паказальнік моцы бальшавізму, сілы і прарыўнасьці яго лёзунгаў, за ажыцьцяўленьне якіх змагаюцца мільёны, шчыльнай сувязі партыі з масамі. За тры кварталы бягучага году ў КП(б)Б прынята **10 тыс. чал.** У часе сталінскага закліку толькі па адным Менску ўступіла ў партыю каля **600 лепшых ударнікаў** кадравых рабочых.

Сярод новага папаўненьня кандыдатаў, аднак, многія не прайшлі школы клясавай барацьбы пры царызьме, ня маюць неабходнага палітычнага кругавіду. Гэтыя кадры, пераважна з моладзі, складаюць значную частку цяперашняй кандыдацкай масы. Кандыдатаў-жа па асобных раённых арганізацыях — 45-47 проц., а то і палова ўсёй арганізацыі.

Адсюль ясна, наколькі важным зараз зьяўляецца пытаньне аб рабоце з кандыдатамі.

Ня гледзячы на тое, што ліпеньскі пленум ЦК КП(б)Б асабліва вынукліў гэту задачу, мы ўсё-ж ня маем сур'ёзнага зруху ў рабоце з кандыдатамі. Толькі Менская парторганізацыя ў апошні час праводзіць значныя і вельмі важныя мерапрыемствы. У большасьці-ж раёнаў, як і раней, пануюць недапушчальныя адносіны да работы з маладымі членамі партыі і ў асаблівасьці з кандыдатамі.

Вельмі часта, амаль на кожным прадпрыемстве і ва многіх вясковых ячэйках, прыходзіцца сустракацца з кандыдатамі, якія пратэрмінавалі свой стаж. Па 2-3 і нават больш гадоў сядзяць у кандыдатах падрыхтаваныя і непадрыхтаваныя для пераводу ў члены маладыя партыйцы.

«Зьвязда» ня раз прыводзіла факты, калі падрыхтаванага таварыша «забываюць» перавесьці таму, што «ён і так добры камуніст», актыўна працуе, а непадрыхтаванага марынуюць, бо не знаходзяць часу займацца яго выхаваньнем. Фармальны, бюракратычны падыход да кандыдата часамі пераходзіць усякія межы.

Напрыклад, **Сівуха Леў Мікалаеў**, член калгасу «Парастак сацыялізму» (Рэчыца), у 1930 г. прынят кандыдатам, мае картку, плаціць узносы. Адбыўшы кандыдацкі стаж, Сівуха падаў заяву аб пераводзе. Ячэйка перавяла. Прыймовая камісія райкому разгледзела паперы і пастанавіла «прыняць у кандыдаты». І толькі праз год, пасьля доўгай цяганіны, Сівуху ўдалося, нарэшце, давесьці, што ён кандыдат з 1930 г. і нават у 1931 г. пераведзен ячэйкай у члены.

У сувязі з гэтым прыходзіцца яшчэ і яшчэ раз напомніць, што кандыдацкі стаж — **ня пустая фармальнасьць.** Ён «мае на мэце грунтоўнае азнаямленьне з праграмай і тактыкай партыі і праверку асабістых якасьцяй кандыдата» (статут).

Абавязак партыйнай ячэйкі наладзіць выхаваньне кандыдата так, каб ён штодзённа спалучаў тэарытычную вучобу, азнаямленьне з праграмай і тактыкай партыі, з практычнай работай, на якой правяраюцца яго «асабістыя якасьці».

Перш за ўсё задача кожнай арганізацыі — ахапіць **пагалоўна** ўсіх кандыдатаў марксыцка-ленінскім выхаваньнем. Гэта асабліва важна для вёскі, дзе маладому камуністу ў сваёй рабоце прыходзіцца на практыцы перамагаць кулацкае супраціўленьне, дробна-ўласьніцкія тэндэнцыі і звычаі. Вучоба кандыдатаў як на вёсцы, так і ў горадзе не пастаўлена на патрэбную вышыню. Нават на многіх менскіх прадпрыемствах кандыдацкія школы толькі зараз пачынаюць працаваць.

Каб ісьці ўперадзе мас, на чале гэтых мас, весьці актыўную барацьбу за генэральную лінію партыі, малады камуніст павінен **сыстэматычна павышаць свой тэарытычны і палітычны ўзровень.**

Наладжваючы марксыцка-ленінскае выхаваньне кандыдата, «партыйныя арганізацыі павінны з дня на дзень вывучаць уступаючых у партыю, правяраючы выкананьне імі нагрузак, паводзіны на вытворчасьці, работу ў грамадзкіх арганізацыях, ступень актыўнасьці ў штодзённай барацьбе за пастановы партыі» **(Постышаў).**

На асобных прадпрыемствах і, у прыватнасьці, на фабрыцы «Кастрычнік» (Менск) ёсьць ужо даволі багаты вопыт работы з кандыдатамі. Аб ім ужо расказвала «Зьвязда». Гэты вопыт неабходна выкарыстаць.

У рух патрэбна прывесьці рознастайныя формы і мэтады работы (узаемная праверка выкананьня кандыдатамі нагрузак, палітбаі, кандыдацкія дні і г. д.). Усе гэтыя формы павінны быць шырока ўжыты зараз у сувязі з падрыхтоўкай да ўсебеларускага кандыдацкага дня, які праводзіцца 5 сьнежня.

ЦК КП(б)Б у пастанове аб гэтым дні паставіў перад кожнай арганізацыяй, кожнай ячэйкай задачу **«дабіцца сапраўднай нагрузкі і якаснага ўліку кандыдатаў партыі, сыстэматычнага вывучэньня партыйнай, вытворчай і грамадзкай актыўнасьці кандыдата, аказаньня практычнай дапамогі ў рабоце, праверкі адносін яго да партабавязкаў** (партвучоба, наведваньне партсходаў, выплата членскіх узносаў і г. д.), **поўнага ахопу партвучобай і сваячасовага пераводу ў члены партыі».**

Кандыдацкі дзень павінен паслужыць магутным штуршком для наладжаньня **пастаяннай і настойлівай** работы па выхаваньні маладых камуністаў, пашырэньні іх палітычнага кругавіду, павышэньні іх кіруючай, авангардай ролі.

Ленінграду адгружана 191.000 тон бульбы

ЗАДАНЬНЕ ВЫКАНАНА

Учора адпраўлены апошнія вагоны з бульбай Ленінграду. Наша рэспубліка першай у Саюзе выканала поўнасьцю свае абавязкі перад пралетарамі гораду Леніна

Скончыўшы адгрузку, мы ні ў якім разе не павінны паддацца дэмабілізацыйным настроям. Плян бульбазагатовак для задавальненьня патрэбаў прамысловасьці і рабочых цэнтраў БССР далёка ня выкананы.

Раённыя партыйныя і загатоўчыя арганізацыі павінны працягваць барацьбу на фронце бульбазагатовак, забясьпечыць сваячасовую рэалізацыю вызначаных заданьняў.

Неабходна максымальна ўзмоцніць тэмпы загатовак збожжа і ільну. Уперад, да новых посьпехаў!

Бабруйск завяршае загатоўкі бульбы

БАБРУЙСК, 28.

На 26 лістапада Бабруйскі раён выканаў поўнасьцю плян адгрузкі бульбы ў 7.279 тон. Гадавы плян бульбазагатовак на сёньняшні дзень рэалізован на 92 проц.

Гэта перамога атрымана ў выніку бальшавіцкай настойлівасьці бабруйскай партарганізацыі, узмоцненага націску на кулацка-заможныя элемэнты, шырокага разгортваньня масавай агітацыйна-растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў.

У першай палове кампаніі Бабруйскі раён цягнуўся ў хвасьце адсталых. Толькі пасьля прыезду ў раён першага сакратара ЦК КП(б)Б т. Гікало быў дасягнут рэзкі пералом, які раённае кіраўніцтва і газэта «Камуніст» замацавалі для пасьпяховага завяршэньня адгрузкі бульбы Ленінграду.

Урокі загатовак і адгрузкі бульбы павінны быць улічаны бабруйскімі арганізацыямі. Апраўдаўшыя сябе мэтады масавай работы трэба практыкаваць у збожжа і ільназагатоўках з тым, каб і на гэтых вучастках дабіцца рашаючай перамогі

Л. К.

Паданы паражняк не скарыстоўваецца

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Рад сельсаветаў раёнаў: Урыцкі, Раманавіцкі, Прыбарскі, Клімаўскі і інш. дагэтуль яшчэ ня выканалі сваіх заданьняў па бульбазагатоўках. У гэтых сельсаветах не разгорнута масава-растлумачальная работа, няма націску на кулацка-заможныя гаспадаркі.

У сярэднім на адгрузачныя пункты паступае штодзённа ня больш 25-30 тон. Пункты працуюць ня з поўнай нагрузкай. За апошнія дні гомельскі эксплёатацыйны раён паленнуў падачу вагонаў, але апошнія не выкарыстоўваюцца. Так, 24 лістапада быў прадстаўлен 81 вагон, але загатоўчыя арганізацыі адгрузілі толькі 5. 25 лістапада падана 47 вагонаў, загружана 3. Гэтыя лічбы лішні раз сьведчаць аб бязьдзейнасьці ў адгрузцы раду нізавых загатоўчых арганізацый і сельсаветаў.

М. Г.

Кулацкі сабатаж не сустракае адпору

ПЛЕШЧАНЦЫ.

Раён яшчэ ня выканаў свайго абавязку перад пралетарамі Ленінграду. На 26 лістапада замест 1.260 тон, вызначаных па пляну, адгружана толькі 1.088 тон.

Зарэцкі, Каменскі і Аміншаўскі сельсаветы ўжо скончылі адгрузку. Набліжаюцца да выкананьня пляну Завішынскі і Ганцаўскі сельсаветы. Але значная частка сельсаветаў яшчэ адстае. Гэта тлумачыцца адсутнасьцю жывога апэрацыйнага кіраўніцтва ў сельсаветах і слабай масавай работай.

Вось, для прыкладу, **Акалоўскі** сельсавет, дзе плян адгрузкі выканан толькі на 72 проц. Члены сельсавету — **Грыдзюшка і Вільтоўская** дагэтуль яшчэ самі не здалі бульбы. У гэтым-жа сельсавеце кулацкі сабатаж не сустракае адпору. Цьвёрдазаданьнік Залуцкі Язэп павінен здаць 10 цэнт. бульбы, а здаў толькі 5,5 цэнт. Цьвёрдазаданьнік Далёпак замест 10 цэнт. здаў толькі 3,8 цэнт. Замест здачы бульбы дзяржаве, заможнікі вывозяць яе на рынак і прадаюць па спэкуляцыйных цэнах.

МОДЛІН.

Канкрэтнае кіраўніцтва ільнаапрацоўкай падмяняецца рэзалюцыямі

ПЛЯН ВЫКАНАН НА 1,6 ПРОЦ.

16.000 цэнт. пянькі павінна даць БССР соцыялістычнай прамысловасьці ў 1932-33 годзе.

Загатоўкі-ж пянькі ідуць зусім дрэнна. На 25 лістапада па рэспубліцы загатоўлена толькі 268 цэнт. **Плян выканан на 1,6 проц.**

Першапачатковая апрацоўка пянькі (замочка, мяцьцё і трапаньне) не арганізаваны. Партыйныя арганізацыі рашаючых калгаспаводчых раёнаў зусім не аддаюць увагі гэтай справе. **Хойніцкі, Касьцюковіцкі, Чырвонапольскі, Кармянскі, Мазырскі, Мсьціслаўскі, Клімавіцкі і Любаньскі,** якія маюць найбольшыя пляны па загатоўках пянькі, у лепшым выпадку выканалі іх на 1,7 проц. Мсьціслаўскі і Клімавіцкі раёны яшчэ не разпачалі загатовак.

Па сэктарох загатоўчы плян на 25 лістапада выкананы: калгасамі на 2,7 проц., аднаасобнікамі — 1,3 проц.

Асобна трэба спыніцца на спагнаньні цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможнай часткі. Два цэнтнэры — 0,2 проц. здалі кулакі і заможнікі па рэспубліцы. Раённыя арганізацыі паміма сваёй волі даюць магчымасьць кулакам і заможнікам разбазарыць пяньку. Такое становішча далей нельга цярпець. З гэтай групы насельніцтва неабходна ў найхутчэйшы тэрмін спагнаць цьвёрдыя заданьні.

Апрацоўцы і загатоўкам пянькі — больш увагі! Шырэй масавую работу сярод калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў.

Вынесшы пастанову супакоіліся

ЛЕПЕЛЬ. (Наш кар.). 20 кастрычніка бюро райкому партыі, заслухаўшы інфармацыю аб ільназагатоўках, у пастанове запісала: «Парт'ячэйкі, сельсаветы, МТС і райкалгасаюз канкрэтна і апэрацыйна ня кіруюць ільназагатоўкамі» і т. д. Тут-жа была прынята пастанова, вельмі добрая па сваёй мэтаімкнёнасьці — «да 15-й гадавіны Кастрычніка загатовіць ня менш 40 проц. гадавога заданьня ільнавалакна».

Прашоў месяц пасьля ўхваленьня гэтай пастановы. На днях бюро райкому зноў падвяло вынікі работы за гэты месяц і апынулася перад кур'ёзным фактам. Загатоўкі ільнавалакна па раёне ня рушыліся з месца. На 23 лістапада плян выканан на 4,7 проц., па цьвёрдых заданьнях спагнана 3,6 проц., калгасы МТС здалі 3,3 проц.

У чым прычына такога зьявішча? А справа зусім простая. Райком партыі, вынесшы добрую пастанову, на гэтым супакоіўся. Упаўнаважаныя РВК, райкому і парт'ячэйкі, захапіўшыся бульбазагатоўкамі, забыліся нават, што была пастанова аб ільназагатоўках.

Апрача таго трэба сказаць, што ў Лепельскім раёне не вядзецца барацьбы са стратамі ў ільнаводзтве. У калгасе **«Працаўнік»**, Сьвяцкага сельсавету, лён з плошчы ў 70 гакт. не пасланы, у арцелі **«Бядняк»** лён пагніў, а ў калгасе імя Нямецкага пралетарыяту траста пералежыла на сьцелішчы. У гэтым і крыецца нізкая якасьць паступаючага валакна на загатоўчыя пункты. Калгасы здаюць ільнавалакно пятага нумару, а аднаасобнікі яшчэ горшае — 3-га і 2-га.

Ц. Дзерах, Р. Сімховіч.

Ні аднаго кілёграму

УВАРАВІЧЫ. (Наш кар.). Вельмі часта ў мястэчку Ўваравічах — раённым цэнтры — назіраецца продаж ільнавалакна аднаасобнікамі.

Пяць сельсаветаў **(Сьмычкоўскі, Бярвёнаўскі, Борхаўскі, Калінінскі і Лапіцкі)** не загатовілі ні аднаго кілёграму валакна. Раённы-жа плян па аднаасобным сэктары на 20 лістапада выканан на 32 проц.

Вывады напрошваюцца самі. Ва Ўваравіцкім раёне няма барацьбы з кулацкімі элемэнтамі, якія выкарыстоўваюць спажывецкія настроі аднаасобнікаў і адсталай часткі калгасьнікаў, дабіваюцца асяданьня сырцу на месцы і спэкуляцыі валакном на рынку.

Задача партарганізацыі — растлумачыць калгасьнікам, беднякам і сераднякам — аднаасобнікам, што іх першачарговай задачай зьяўляецца выкананьне сваіх абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай.

А. КАЗІМІРАЎ.

Саўгасы „Бігосава" і „Боркавічы" адстаюць

ДРЫСА. Саўгасы «Бігосава» і «Боркавічы» не змагаюцца за сваячасовую здачу ільнянога семі і ільнатрасты па вызначаным ім пляне.

Яны павінны здаць трасты 390 тон, а па 25 лістапада здана толькі 131,2 тоны, або 33,6 проц. Насеньня здана 37,6 тон замест 100 тон.

Ільнатрасту падзялілі

КАЙЛЛЬ. (Наш кар.).

На 20 лістапада плян загатовак ільнавалакна на раёну выканан на 20 проц. Асабліва адстаюць калгасы, якія свае заданьні выканалі толькі на 3 проц.

Старшыня райкалгассаюзу пераапрацоўку і здачу ільнавалакна лічыць другараднай справай, яго гэта менш за ўсё цікавіць. Настрой раённага «начальства» перадаўся ў сельсаветы. Калгасы **«Пралетары», «Знарґія»** і інш. пераапрацоўку ільну адкладваюць на студзень-люты месяцы.

Клясана-варожыя элемэнты выкарыстоўваюць бязьдзейнасьць райкалгассаюзу для сваіх мэт. Кулак агітуе супроць здачы ільнавалакна дзяржаве. Так, напрыклад, у калгасе **«Чырвоны партызан»** ільнатрасту пукамі падзялілі паміж калгасьнікамі, а дзяржаве нічога не здалі. Такія факты ёсьць і ў калгасе **«Дырыжабль».**

Палітычная блізарукасьць кіраўнікоў Капыльскага райсаюзу толькі на руку клясаваму ворагу. Райком КП(б)Б павінен ужыць адпаведныя захады, праверыць наколькі кіраўніцтва РКС здольна выконваць дырэктывы партыі па важнейшых гаспадарча-палітычных кампаніях.

В.

ЗА МЯЖОЙ

Польшча ратыфікавала савецка-польскі пакт аб ненападзе

ВАРШАВА, 27. Прэзыдэнт Польшчы Масьціцкі падпісаў сёньня акт ратыфікацыі дагавору аб ненападзе і ўзгаджальнай канвэнцыі паміж СССР і Польшчай.

Паведамленьне ТАСС

Прэзыдыум ЦВК СССР ратыфікаваў савецка-польскі пакт аб ненападзе, падпісаны ў Маскве 25 ліпеня бягучага году, і ўзгаджальную канвэнцыю, падпісаную 23 лістапада бягучага году.

Водгукі польскай прэсы

ВАРШАВА, 28. Друк публікуе паведамленьне аб ратыфікацыі пакту, забяспечанае афіцыяльным растлумачэньнем, што ратыфікацыя зроблена прэзыдэнтам на аснове 49-га артыкулу канстытуцыі. Газэты перадаюць, што абмен ратыфікацыйнымі граматамі паміж Польшчай і СССР адбудзецца ў бліжэйшы час у «вельмі ўрачыстай абстаноўцы».

* * *

ВАРШАВА, 28. Газэта **«Наш пшэглёнд»** піша: «Фармальна прэзыдэнт польскай рэспублікі мае, здаецца, права заключаць палітычныя згоды з іншымі дзяржавамі, калі ў іх не прадугледжана змяненьне граніц і не вызначаюцца саюзныя адносіны... Аднак, ужо ў свой час мы зьвярнулі ўвагу на тое, што пастанова аб ратыфікацыі, прынятая аднагалосна соймам, мела-б больш палітычнае значэньне. Яна яшчэ раз даказала-б, што ўсе польскія партыі, а таксама арганізацыі нацыянальных меншасьцяй жадаюць умацаваньня мірных адносін з усходнім суседам. Закончыўшы шматгадовыя спрэчкі вакол бэсарабскай праблемы, Польшча ўступіла нарэшце на шлях самастойнай усходняй палітыкі. Румынія аказалася ў тупіку з прычыны двуліцай тактыкі міністра Тытулеску».

«Наш пшэглёнд» піша далей»: Гандлёвы дагавор і транзітная згода, якія расчышчаюць нам шлях на Бліжні і Далёкі Ўсход—такая гістарычная неабходнасьць перад тварам якой бляднее пэрспэктыва «аслабленьня» супрацоўніцтва з Румыніяй. Мы ніколі не перацэньвалі значэньня саюзу з Румыніяй, які натуральна траціць сваю вагу, калі зьнішчана небясьпека ўзброеных сутычак з саветамі».

Расправа японскіх акупантаў у Манчжурыі

Польская буржуазная прэса паведамляе, што японскія войскі **расстралялі ў Манчжурыі 2.700 кітайскіх сялян, у тым ліку жанчын і дзяцей. Тры вёскі зраўнаны з зямлёй.** Сяляне расстраляны кулямётным агнём па абвінавачаньні ў падтрыманьні партызанскага руху ў Манчжурыі.

Польская прэса між іншым падае падрабязнасьці гэтай крывавай расправы. Японцы аддалі загад тром кітайскім вёскам, разьмешчаным на ўсход ад Мукдэну, сабрацца ў полі для правядзеньня ў іх вобыску і апазнаньня тых з іх, што супрацоўнічалі з партызанамі.

Замест вобыску акупанты загадалі ўсім імстаць на калені, пасьля чаго скасілі кулямётным агнём. Уся маемасьць расстраляных і іх зямля **перададзены японскім калёністам.**

Японскія пагрозы ў Жэнэве

ТОКІЁ, 28. Як паведаляе агэнцтва Домэй Цусін, у японскіх інструкцыях, пасланых японскім урадам дэлегацыі ў Жэнэву, падкрэсьлівецца, што Японія прыме «любое рашэньне па манчжурскім пытаньні» на падставе прызнаньня існаваньня манчжурскага ўраду і на пацьвярджэньні правамоцтві прызнаньня манчжурскай дзяржавы Японіяй. У выпадку, адхіленьня гэтых умоў японская дэлегацыя, згодна інструкцыі, павінна пакінуць сэсію Лігі.

У міністэрстве замежных спраў пацьвярджаюць, што для Японіі ўжытна толькі такое рашэньне, якое аднавіла-б пазыцыі вышэй умоцкам. У міністэрстве замежных спраў, аднак, лічаць, што японская дэлегацыя, як было пастаноўлена яшчэ пры ўрадзе Інукай, пакіне сэсію Лігі нацый у крайнім выпадку, прычым уход дэлегацыі з сэсіі не азначае, што Японія выходзіць з складу Лігі нацый. Японія лічыць за лепшае застацца ў Лізе і працягваць барацьбу супроць неправільных пастаноў Лігі нацый.

ПРАЕКТ СТВАРЭНЬНЯ УРАДУ „МОЦНАЙ РУКІ"

Шлейхэр—кандыдат на пост канцлера

БЭРЛІН, 27. Як паведамляюць газэты, у якасьці аднаго з найбольш праўдападобных выхадаў з урадавага крызісу намячаецца стварэньне ўраду «моцнай рукі». Згодна паведамленьня «Бэрлінэр Бэрзэнцайтунг» Гінденбурґ высоўвае патрабаваньне, каб новы канцлер «карыстаўся абсалютна неабмежаваным даверам з боку прэзыдэнта і знаходзіўся ў згодзе з міністрам рэйхсвэру. Паводле вестак газэты, новы канцлер павінен дасягнуць згоды з правымі партыямі, а так сама стварыць магчымасьць адарыцьця рэйхстагу толькі вясною 1933 г., не распускаючы яго. Кандыдатам на пост такога канцлера газэты называюць міністра рэйхсвэру **Шлейхэра.**

Як паведамляе «Форвэрц» Шлейхэр нібы заявіў ужо аб сваёй гатоўнасьці пачаць перагаворы з партыямі з тым, каб скончыць іх у сярэдзіне гэтага тыдню. Тую-ж вэрсыю паўтарае і «Дойчэ Альгемайне Цэйтунг». Газэта падкрэсьлівае пры гэтым, што выстаўленьне кандыдатуры міністра рэйхсвэру на пост канцлера яшчэ больш узмацняе ролю армії ў палітычным жыцьці Германіі.

«Бэрлінэр Бэрзэн цэйтунг»—таксама за стварэньне ўраду «моцнай рукі». Газэта рэкамэндуе поваму ўраду заручыцца ў барацьбе супроць кінага рабочага фронту безагаворачным падтрыманьнем з боку нацыянал-сацыялістаў. (ТАСС).

За паўгода закрыта 7 тысяч прадпрыемстваў

БЭРЛІН, 21. За пэрыяд з 1 чэрвеня бягучага году ў Германіі закрыліся 7 тыс. прамысловых прадпрыемстваў. За апошні час пастаўлены на крыкол у сувязі са скарачэньнем суднаходзтва 80 параходаў.

Беспрацоўе сярод інтэлігенцыі ў Германіі

БЭРЛІН. На сходзе нядаўна арганізаванага «таварыства дапамогі германскім акадэмікам» дакладчык указаў, што **з 375 тыс. асоб,** скончыўшых нядаўна вышэйшыя навучальныя ўстановы і атрымаўшых дыплёмы дактароў, юрыстаў, інжынэраў і г. д., **каля 75 тыс.,** г. зн. 20 проц. знаходзяцца без работы. У адным Бэрліне налічваецца 9 тыс. чалавек, якія скончылі вышэйшыя навучальныя ўстановы і якія ня могуць знайсьці сабе работы па спэцыяльнасьці.

Беспрацоўныя Францыі дэманструюць супроць вайны

ПАРЫЖ, 22. Згодна паведамленьню камуністычнай «Анюмэ», якая выдаецца ў Ліле, мэр гораду Сэнт Аман каля Валансьен, дэпутат і адзін з лідэраў паўночнай федэрацыі сацыялістычнай партыі — Куто, карыстаючыся крызісам і ростам беспрацоўя, мабілізаваў 50 беспрацоўных на работы па фартыфікацыі паўночных межаў Францыі. Мабілізаваныя, сабраўшыся перад мэрыяй, наладзілі дэманстрацыю пратэсту з пяньнем «інтэрнацыяналу» і крыкамі «далоў фартыфікацыю, далоў вайну, нехай жывуць Саветы».

Падзяка буржуазнай „бацькаўшчыны"

ВАРШАВА, 26. 30 ваенных інвалідаў у Варшаве, даведзеных да роспачы беспрацоўем і голадам, **абвясьцілі ўчора галадоўку,** патрабуючы павышэньня дапамогі або прадастаўленьня работы. Інвалёды закрыліся ў памяшканьні свайго саюзу. Дапамогі беспрацоўных інвалідаў складаюць **10-50 злотых** (1 злоты каля 22 кап.) у месяц. Большасьць інвалідаў беспрацоўных на працягу 2-3 год. Многім з іх пагражае выселеньне з кватэр.

Польска-данцыгскі канфлікт абвастраецца

БЭРЛІН, 26. Канфлікт паміж Польшчай і Данцыгам, з'новаду дэкрэтыванага Польшчай пераводу на польскую валюту ўсіх апэрацый па чыгунках у Данцыгскай вобласьці абвастраецца. З Данцыгу паведамляюць, што Польшча ўжо праводзіць тэхнічную падрыхтоўку да правядзеньня ў жыцьцё гэтага дэкрэту з 1 сьнежня. У сувязі з гэтым адміністрацыя ўсіх транспартных прадпрыемстваў Данцыгу рыхтуе контрмерапрыемствы, якія фактычна павінны зьвесьціся да байкоту польскіх чыгунак. З гэтай мэтай з 1 сьнежня значна зьніжаюцца тарыфы на трамвайных і аўтобусных лініях Данцыгскай вобласьці, пашыраецца сетка гэтых ліній пры адначасовым пераводзе іх на кругла-сутачны рух і г. д. (ТАСС).

Інфармацыйнае паведамленьне

З 24 па 27 лістапада 1932 году адбыўся пленум ЦКК КП(б)Б, на якім разглядваны наступныя пытаньні:

1. Аб выкананьні пастаноў партыі і ўраду па рэзалюцыйнай законнасьці і задачах органаў КК-РСІ.

2. Аб выкананьні пастаноў ЦК УсеКП(б) і ліпеньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б па калгасным гандлі і самазагатоўках.

3. Вынікі перабудовы работы партколегіі ў натрамку барацьбы з недаровымі зьявішчамі і папярэджаньня іх у КП(б)Б.

Пленум ЦКК КП(б)Б увёў у склад пленуму ЦКК КП(б)Б:

1) членам прэзыдыуму і парткалегіі ЦКК КП(б)Б тав. Гуревіча Л. і зацьвердзіў яго загадчыкам арт. інструктарскага аддзелу ЦКК.

2) Членам пленуму, членам прэзыдыуму і парткалегіі ЦКК КП(б)Б тав. Жукава (сакратара АПК).

3) У склад прэзыдыуму ЦКК тав. Прусакову.

4) У склад парткалегіі тав. Сьвярдлову.

5) У склад пленуму ЦКК тав. Камарова.

ЦКК КП(б)Б.

IV сэсія ЦВК БССР

Пастанова прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

I. Склікаць IV сэсію Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР X скліканьня 3-га студзеня 1933 г. у г. Менску.

II. Зацьвердзіць наступны парадак дня IV сэсіі:

1. Кантрольныя лічбы народнай гаспадаркі БССР на 1933 г. (Дакладчык — старшыня Савету Народных Камісараў БССР тав. М. М. ГАЛАДЗЕД);

2. а) Дзяржаўны бюджэт на 1933 г. (Дакладчык — т. А. І. ХАЦКЕВІЧ);

б) Суадклад бюджэтнай камісіі ЦВК БССР па дзяржаўным бюджэце на 1933 г.;

3. Даклад аб пасэўных плянах на 1933 год і аб практычнай рабоце ў барацьбе за ўзьняцьце ўраджайнасьці (дакладчыкі т. т. РАЧЫЦКІ, МАСЮКОЎ і ТАМАШЭЎСКІ);

4. Зацьвярджэньне важнейшых пастаноў, прынятых за час ад III сэсіі ЦВК БССР (дакладчык—т. М. П. ГНІЛЯКЕВІЧ).

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Вык. аб. сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР М. ЛЯЙКОЎ.

27 лістапада, 1932 г.

г. Менск.

На пленуме Менгаркому КП(б)Б

26 лістапада на вячэрнім пасяджэньні пленум заслухаў даклад сакратара гаркому тав. Чарнушэвіча аб мерапрыемствах па павышэньні ўраджайнасьці і падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

Тав. Чарнушэвіч адзначыў вялікія дасягненьні ў сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі раёну, якім ахоплена звыш 60 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Знач на палепшыўся дабрабыт калгасьніка. А гэтым красамоўна гавораць наступныя факты: **Касьцянецкі Антон,** член калгасу «Перамога», Каралінчанскага сельсавету, якому раней ніколі не хапала хлеба да новага ўраджаю, атрымаў па працадзён 145 пуд. жыта, 360 пуд. бульбы, 1.320 руб. грашыма і інш. прадукты. **Леўшыц Паўла** да ўступленьня ў калгас меў 3 га зямлі, адну карову і аднаго каня. Сям'я — дзевяць душ. Раней хлеба меў ня больш як на 2-3 месяцы. Зараз, выпрацаваўшы 616 працадзён, ён атрымаў: 77 пуд. жыта, 237 пуд. бульбы, 588 руб. 65 кап. грашыма і інш. Гэта апрача значнай колькасьці прадуктаў, якія калгасьнікі атрымліваюць ад сваіх вучасткаў.

Такіх прыкладаў можна прывесьці шмат. Яны сьведчаць аб тым, што ўмацоўваюцца калгасы, расьце дабрабыт калгасьнікаў.

Але пры ўсіх гэтых дасягненьнях нельга абыйсьці таго факту, што барацьба за павышэньне ўраджайнасьці праходзіць вельмі марудна, невыстарчальна. А барацьба-ж за ўзьняцьце ўраджайнасьці — цэнтральнае пытаньне падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі і адно з буйнейшых пытаньняў арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Мы маем вялізарныя магчымасьці для ўзьняцьця ўраджайнасьці. Па Менскім раёне сярэдні ўраджай з га жыта 7,5 цэнтн., па БССР 6,9 цэнтн. Калі параўнаць гэты ўраджай з ураджаем, напрыклад, Германіі (17 цэнтн. з га), Бельгіі (23 цэнтн.) і інш. краін, дык зусім ясна, якія задачы яшчэ стаяць перад намі. Ужываньне самых элемэнтарных аграмерапрыемстваў, як ачыстка і пратручваньне насеньня, арганізацыя правільнага севазвароту і інш., дасьць сотні мільёнаў дадатковага таварнага збожжа.

— Мы ня выканалі пляну павышэньня ўраджайнасьці ў 1932 годзе, — гаворыць тав. Чарнушэвіч. — Да гэтага пытаньня дзе ні-дзе падыходзяць нядбайна, няўважліва. Некаторыя калгасы нездавальняюча правялі асеньні-пасеўную кампанію, дрэнна апрацоўваючы глебу. Мясцамі такая нядбайнасьць мяжуе са шкодніцтвам. Напрыклад, старшыня калгасу «Вызваленьне» тав. Ундзін пасеяў жыта на пустой зямлі, у той час, калі ў стайнях і хлявох засталося гною на 10 га.

Трэба дабіцца таго, каб такой нядбайнасьці ня было ў веснавую сяўбу 1933 году. Трэба зараз-жа распачаць рамонт машын, зімой вывезьці на поле гной, набыць мінэральнае ўгнаеньне, правесьці поўную ачыстку і пратручваньне насеньня і г. д. Трэба на прыкладах перадавых калгасаў даказаць, што раньняя сяўба значна павышае ўраджай насьць.

Пасьля дакладу тав. Чарнушэвіча пленум аднагалосна прыняў рэзалюцыі па ўсіх трох дакладах, заслуханых на пленуме, і вырашыў арганізацыйныя пытаньні.

***

Бурнымі аплёдысмэнтамі пленум сустрэў выступленьне першага сакратара гаркому і ЦК КП(б)Б тав. **Гікало.**

— Гэты пленум, — сказаў тав. Гікало, — насіў дзелавы, апэрацыйны характар. Ставячы на пасяджаньні пленуму пытаньне аб школе, прамысловасьці, сельскай гаспадарцы, мы паказваем, куды трэба накіроўваць бальшавіцкі агонь, як трэба перамагаць труднасьці.

Далей тав. Гікало спыніўся на задачах поўнага выкананьня збожжа і бульбазагатовак, асабліва па аднаасобным сэктары, які значна адстае.

Навокал усіх гэтых пытаньняў, — кажа тав. Гікало, — ідзе жорсткая барацьба. Кулак, былы чыноўнік, нэпман, пралязючы ў нашы ўстановы ўсякімі мэтадамі перашкаджаюць нашаму сацбудаўніцтву. **Больш клясавай пільнасьці!**

Падрабязна тав. Гікало спыніўся на задачах інтэрнацыянальнага выхаваньня, на задачах барацьбы з вялікадзяржаўным шавінізмам, на палепшэньні работы БАН, Белдзяржкіно і інш. устаноў, якія ў сваёй рабоце маюць значныя прабелы.

Канкрэтна, бяз шуму, бяз крыку, з настой лівасьцю і непрымірымасьцю, вартай бальшавікоў, ажыцьцяўляць ленінскія прынцыпы нацыянальнай палітыкі.

Пасьля прамовы т. Гікало т. Чарнушэвіч абвяшчае пленум закрытым.

Зьмены, унесеныя пленумам у склад гаркому КП(б)Б і бюро

Пленум вызваліў ад абавязкаў членаў і кандыдатаў бюро т. т. **Тарасевіча, Мацюкова, Якубовіча і Таруцінскага** ў сувязі з пераходам іх на іншую работу.

Таксама ў сувязі з а'ездам з г. Менску вызвалены ад абавязкаў члены гаркому т. т. **Млодзік, Руценбэрг, Рыжоў, Зайцаў, Мітлін, Дабрын, Красных** і ад абавязкаў кандыдатаў у члены гаркому т. т. **Сыманоўскі і Карпенка.**

Пленум вывеў са складу гаркому т. **Цапкоўскага,** які не забясьпечыў бесьперабойнай работы электрастанцыі, будучы яе дырэктарам, за што зьнят з пасады.

У склад пленуму ўведзены наступныя т.т.: **Брагінскі** — рэдактар газэты «Зьвязда», **Горачаў** — камандзір Н-й дывізіі, **Дзеніскевіч** — нам. заг. аргаддзелу, **Кавалёў** — адказны сакратар ЦСПСБ, **Малей** — сакратар ГК ЛКСМБ, **Сосіна** — сакратар бюро партклетку заводу **імя Варашылава, Сухарчук** — дырэктар электрастанцыі, **Турэцкі** — нам. старшыні гарсавету, **Хэйфец** — рэдактар газэты «Рабочай», **Шчагін** — сакратар райкому ЛКСМБ.

Тав. **Кіржаневіч** — загадчык аддзелу кадраў ГК, пераведзен з кандыдатаў у члены бюро.

Сакратарыят ГК зацьверджан у наступным складзе: сакратары ГК т. т. **Гікало, Чарнушэвіч, Шпэктараў,** старшыня гарсавету т. **Валодзька** і старшыня ГСПС т. **Шулькін.**

Школе будаўнічага вучнёўства—неадкладную дапамогу

Шырокі размах прамысловага і камунальнага будаўніцтва, дасягненьні савецкай навукі і тэхнікі, з усёй вострасьцю паставілі пытаньне аб ліквідацыі сэзоннасьці і пераходзе да бесьперапыннага будаўнічага году. У сувязі з гэтым праблема стварэньня пастаяннага складу кваліфікаваных кадраў будаўнікоў набывае асаблівае значэньне.

Адным з асноўных шляхоў вырашэньня дадай праблемы **зьяўляюцца школы будаўнічага вучнёўства.** Задача школ — выхтаваць ня толькі кваліфікаваных рабочых-будаўнікоў, але і ўзбройваць іх тэарэтычнымі ведамі. Адсутэуль зусім ясна і тая ўвага, якая павінна аддавацца іх рабоце.

Аднак, ў практыцы мы маем шмат фактаў недапушчальна агідных адносін да школ будаўнічэтва. За фактамі хадзіць далёка ня трэба. **Возьмем менскую школу Белбудаб'яднаньня,** якая існуе ўжо тры гады. За гэты час яна ня толькі не ўмацавалася і не пашырылася, а наадварот, знаходзіцца на прадодадні развалу. **І толькі таму, што Белбудаб'яднаньне і сэктар кадраў Наркамлёгпраму не ствараюць неабходных умоў для яе работы.**

Для выразнасьці справы прывядзем некалькі даведак. Яшчэ былы ВСНГБ, праектуючы арганізацыю будаўнічага вучэбнага камбінату, вынес пастанову аб уключэньні ў яго данай школы. Сродкі (400 тыс. руб.), вызначаныя на пабудову вучэбнага корпусу і інтэрнату для школы, былі перададзены архітэктурна-будаўнічаму тэхнікуму, які павінен быў адшырываць вядучую ролю ў камбінаце. Але праект так і застаўся праектам. Распачатае будаўніцтва вучэбнага корпусу і зараз яшчэ ня скончана. Інтэрнату таксама няма. У выніку новы асень ні набор вучняў у ліку 210 чал. сарваны.

Факт абураючы. Але ён зусім ня турбуе кіраўнікоў з Белбудаб'яднаньня **(дырэктар тав. Васэрман, загадчык сэктару кадраў тав. Рубенчык).** На запытаньне загадчыка школы «як быць, што рабіць?» яны бездапамочна разводзяць рукамі: «няма грошай, зрабіць нічога ня можам». Тое-ж самае адказваюць і кіраўнікі сэктару кадраў Наркамлёгпраму т. т. **Сьмірноў і Рэдынзман.**

Зараз у школе ёсьць усяго 122 вучні ранейшых набораў. Пасьля доўгіх мытарстваў яны былі размешчаны ў адным з інтэрнатаў політэхнікуму. Вучэбных-жа заняткаў праводзіць няма дзе. І ў гэтым пытаньні кіраўнікі Белбудаб'яднаньня бязьдзейнічаюць. Абяцалі абсталяваць часьцю новага вучэбнага корпусу, але абяцаньне засталося толькі абяцаньнем. Будаўнічы інстытут (дырэктар тав. Кузьзіч), над вешнам якога знаходзіцца зараз будаўніцтва корпусу, таксама адмовіўся адпусьціць сродкі на ўстанаўленьне паравога апаленьня.

Так [illegible] спраза з памяшканьнем для [illegible] якім, трэба сказаць, [illegible] і.

Менск, друкарня «Зьвязды».

Змагацца за сваячасовае паступленьне ўсіх плацяжоў па кожраму раёну і сельсавету

Конкурс друку—вагар у барацьбе за фінплян

Фінансавы плян чацьвертага кварталу ў БССР на 20 лістапада выкананы на 52,8 проц., у тым ліку па абавязковых плацяжох на 67,7 проц., а па добраахвотных —толькі на 32,2 проц.

Самымі адсталымі вучасткамі зьяўляюцца: пазыка «4-га завяршальнага», квартальнае заданьне па якой выканана толькі на 32,6 проц.; па ўкладах у ашчадныя касы ёсьць адліў; па паеў у спажывецкую кааперацыю плян выканан толькі на 45,8 проц.

Рашаючае значэньне ў выкананьні фінансавага пляну мае шырока разгорнутая палітычна-масавая работа сярод працоўных. Практыка паказала, што бяз правільнай яе арганізацыі, бяз шырокай дапамогі рабочых і калгасных мас, без актыўнага ўдзелу ўсіх пралетарскіх і ў першую чаргу партыйных арганізацый і друку,—сваячасовае выкананьне фінпляну немагчыма.

Заслаўскі раён на 20 лістапада выканаў квартальны фінансавы плян на 106,1 проц.; **Старобінскі** — на 72,2 проц., **Лепельскі** — на 71,9 проц., **Жыткавіцкі** — на 76,9 проц., **Лельчыцкі** — на 71,7 проц., **Мсьціслаўскі** — на 81,8 проц., **Лёзьнянскі** — на 83,0 проц. Больш таго, **Заслаўскі, Сіроцінскі** і некаторыя іншыя раёны выконваюць свае фінпляны сыстэматычна з кварталу ў квартал, з месяца ў месяц. Гэтага яны дабіліся толькі таму, што фінансавую работу ўзьявілі на належную палітычную вышыню, што раённыя газэты сыстэматычна асьвятлялі ход работы на сваіх старонках, пераносячы лепшыя прыклады і формы ў адсталыя сельсаветы, калгасы і саўгасы.

Наадварот, такія раёны, як **Стара-Дарожкі,** дзе квартальны фінплян выканан толькі на 37,1 проц., а па добраахвотных плацяжох нават усяго на 2,4 проц., **Церахоўскі** — адпаведна на 36,0 і 9,8 проц., **Лоеўскі** — на 36,2 і 11 проц., **Чэрыкаўскі**— на 39,0 і 13,0 проц., **Клічаўскі** — на 39,7 і 14,7 проц. і г. д., — зрываюць заданьне толькі таму, што фінансавая работа ў іх знаходзіцца на задворках.

Зразумела, для таго, каб забясьпечыць сыстэматычнае, з кварталу ў квартал, з месяца ў месяц, з дэкады ў дэкаду, выкананьне фінансавага пляну патрэбна штодзённая ўпартая работа з боку ўсіх партыйных, савецкіх, прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый.

Разгортваючы барацьбу за выкананьне ўсяго фінансавага пляну, **трэба дабіцца таго, каб кожны плацёж паступаў сваячасова і поўнасьцю па кожным раёне, па кожным сельсавеце, саўгасе і калгасе ў паасобку.**

Гэтага патрабуюць інтарэсы сацыялістычнага будаўніцтва, бо, як падкрэсьліў яшчэ ў 1930 годзе ў сваёй пастанове сьнежаньскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б), **«Бяз суровага выкананьня фінансавага пляну немагчыма ажыцьцяўленьне вызначаных гаспадарчых плянаў ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі».**

Зараз праводзяцца тры асноўныя ўсесаюзныя палітычна-масавыя мерапрыемствы, якія павінны прыкаваць увагу ўсёй грамадзкасьці да фінансавых задач, актывізаваць і ўзьняць якасьць масавай работы і забясьпечыць выкананьне фінансавага пляну. Да гэтых мерапрыемстваў адносяцца: **агляд работы фінансавых сэкцый саветаў, конкурс на лепшую культурна-асьветную ўстанову і камісію садзейнасьці і ўсесаюзны конкурс друку.**

Ажывіць работу фінансавых сэкцый, уцягнуць у яе дэпутацкія групы на прадпрыемствах, пабудовах, саўгасах і калгасах, вывявіць фінансавы актыў і ўцягнуць яго ў практычную барацьбу за фінплян — вось асноўная задача агляду фінансавых сэкцый саветаў.

Упяцгнуць у выкананьне фінансавага пляну ўсіх культработнікаў вёскі (настаўнікаў, хатнікаў), закладзіць у кожнай хаце-чытальні, чырвоным кутку, клюбе, пастаноўку растлумачальна-масавай работы — вось задачы фінансавай работы культасьветных устаноў.

Нарэшце, **наладзіць шырокае асьвятленьне ходу фінансавай работы і яе вынікаў на старонках газэт, арганізаваць абмен вопытам работы, весьці рашучую барацьбу з права-апартуністычнай бязьдзейнасьцю і «левымі» заскокамі ў фінансавай рабоце, выхоўваць у працоўных масах правільныя адносіны да фінансавых пытаньняў, да рэжыму эканоміі і г. д. — вось асноўныя задачы конкурсу друку, асноўныя задачы фінансавай работы як цэнтральных і раённых, так і мясцовых шматтыражак і насьценных газэт.**

На жаль, некаторыя газэты замест разгортваньня сапраўднай барацьбы за фінплян абмежаваліся высылкай тэлеграм аб уключэньні ў конкурс, лічачы гэтым справу вычарпанай.

Зразумела, гэтага зусім невыстарчальна. **Мала ўключыцца ў конкурс. Трэба весьці штодзённую неаслабную барацьбу за выкананьне фінансавых заданьняў.**

Добрыя прыклады работы паказала райгазэта **«Калгасьнік Мазыршчыны»,** якая ўключыўшыся ў конкурс, разгарнула на сваіх старонках шырокую палітычна-масавую работу. Разам з гэтым яна правяла нараду фінансавых работнікаў сумесна з актывам, нараду рабселькораў і рэдактароў шматтыражак і насьцегазэт, вылучыла дзьве выязныя рэдакцыі для пасынкі ў сельсавет і г. д. Такую-ж прыкладна работу праводзіць і **рагачоўская** райгазэта **«Камуна».** Але, на жаль, такіх газэт яшчэ пакуль што налічваецца адзінкі. Конкурс друку павінен стаць моцным вагаром у барацьбе за фінплян.

За чатыры дні 37 проц. пляну

КЛІМАВІЧЫ (БЕЛТА). Конкурс друку на лепшае правядзеньне мабілізацыі сродкаў, стаў баявой праграмай работы рэдакцыі газэты «Камуна». Зараз-жа пасьля абвяшчэньня конкурсу яна склікала раённую нараду сакратароў партячэек і сельпартарганізатараў, дзе шырока абгаварваліся ўмовы конкурсу і былі вызначаны канкрэтныя мерапрыемствы работы.

Газэтай «Камуна» вылучана вызная рэдакцыя і праведзены рабселькораўскія зьлёты ў **Пуцімальскім, Зьвянчацкім, Будзякскім** і **Раднянскім** сельсаветах па пытаньні мабілізацыі сродкаў. Рабселькоры гэтых сельсаветаў узялі на сябе канкрэтныя абавязкі па мабілізацыі сродкаў, — ня толькі выканаць, але і перавыканаць фінплян па ўсіх паказальніках. Выязная рэдакцыя райгазэты за адну пяцідзёнку вывяла ў рады перадавых адстаючы **Пуцімальскі** сельсавет. Толькі за чатыры дні ўдарнай баявой работы, прырост фінпляну па гэтым сельсавеце даў 37 проц.

Дзьве выязныя рэдакцыі ў дапамогу адстаючым сельсаветам

БРАГІН (БЕЛТА). Райгазэта «Трыбуна калгасьніка» ўключылася ў конкурс друку. Для ліквідацыі прарываў у выкананьні фінпляну чацьвертага кварталу райгазэтай арганізаваны дзьве выязныя рэдакцыі. Гэтыя рэдакцыі ўжо выехалі ў адстаючыя сельсаветы. У 3-х сельсаветах арганізаваны ўдарныя брыгады друку.

Газэта «Трыбуна калгасьніка» выклікала на сацспаборніцтва хойніцкую райгазэту на лепшае выкананьне фінпляну чацьвертага кварталу.

Райкомам КП(б)Б мабілізавана 25 чалавек райпартактыву, райпрафсаветам — 15 чалавек, райвыканкомам — 13 чалавек. Увесь гэты актыў паслан у сельсаветы.

Перавыбары спажывецкай сыстэмы ператварыць у масавую праверку рэалізацыі дырэктыў аб разгортваньні савецкага гандлю

ГОМЕЛЬСКАЯ КААПЭРАЦЫЯ—НА АГЛЯДЗЕ

ГОМЕЛЬ. Сыстэма спажывецкай кааперацыі Гомельшчыны падыходзіць да агляду работы кааперацыйнай сыстэмы з радам посьпехаў. Завоз прамысловых тавараў у сельскія спажывецкія таварыствы ў трэцім квартале павялічыўся амаль у два разы ў параўнаньні з першым. Паасобныя сельспажыўтаварыствы значна палепшылі абслугоўваньне сваіх пайшчыкаў. Стара-Цярэшкаўскае сельспажыўтаварыства ў трэцім квартале даставіла сваім пайшчыкам тавараў на 90 тыс. руб. і поўнасьцю выканала свой гандальфінплян. У гэтым таварыстве ліквідаваны залежы тавараў. У трэцім квартале і за першыя два месяцы чацьвертага кварталу таварыства загатовіла розных с.-г. прадуктаў на 30 тыс. руб.

Чыгуначная кааперацыя за трэці квартал павялічыла таваразварот да 3 млн. руб., прычым 1.600.000 руб. прыпадае на няплянавыя за затоўкі. Плян самазагатовак выканан на 94,4 проц.

Самазагатоўкі транспартнага спажывецкага таварыства значна палепшылі матэрыяльна-бытавое абслугоўваньне рабочых чыгункі. У трэцім квартале ў няплянавым парадку паступіла гатовай вопраткі на 175 тыс. руб., трыкатажу і галянтэрэі—на 262 тыс. руб.

На заводзе імя Ланцуцкага кожны рабочы 60 проц. свайго заработку выдаткоўвае ў крамах і сталоўцы ЗРК, воднікі — 70 проц. свайго бюджэту рэалізуюць праз кааперацыю. Такое становішча мы маем там, дзе ЗРК перабудавалі сваю работу, дзе кааперацыйная праца стала справай усёй рабочай грамадзкасьці.

Аднак яшчэ шмат што трэба зрабіць, каб палепшыць абслугоўваньне мас пайшчыкаў, каб ліквідаваць тыя хібы, якія яшчэ назіраюцца ў рабоце спажывецкай сыстэмы. ЗРК прадпрыемстваў Гомелю слаба змагаліся за арганізацыю ўласных гаспадарак, за стварэньне харчовай базы. Далёка не ліквідаваны ўтрыманчыя настроі, калі кааперацыйныя работнікі чакаюць паступленьне тавараў з цэнтру і нічога ня робяць, каб зэкацца самазагатоўкамі.

Вялікая яшчэ цякучасьць кіруючых кадраў кааперацыі. За першае паўгодзьдзе па Гомельскіх разне зьмянілася 10 старшынь сельспажыўтаварыстваў, 8 членаў праўленьня і 22 загадчыкі крам. Цякучасьць спрыяла безадказным адносінам да работы, растратам і самаснабжэньню. За апошні час па сельспажыўтаварыствах выяўлена растрат на 48 тыс. руб.

Сельспажыўтаварыства Касьцюкоўскага сельсавету, плян мабілізацыі сродкаў у трэцім квартале выканала ў разьмеры 22 тыс. руб. за мест 33 тыс. руб. У гэтым таварыстве ёсьць залежы няходкіх тавараў, мала што зроблена, каб завазіць больш тавараў шырокага спажываньня, патрэбных спажыўцу.

Зараз па Гомельскім раёне разгарнулася справаздачна-перавыбарчая кампанія. На радзе прадпрыемстваў, як завод імя Ланцуцкага, «Палесдрук», чыгунка арганізаваны рабочыя брыгады, якія правяраюць работу ЗРК, сталовых, буфэтаў і інш. Дрэнна стаіць справа на вёсцы, дзе масы пайшчыкаў яшчэ не прыцягнуты да перавыбараў. Тут яшчэ непачаты край работы.

Н. ГАСМАН, Ф. ПАПЯРЭЦКІ.

Да перавыбараў не падрыхтаваліся

МАГІЛЕЎ. З пачатку перавыбараў спажывецкай кааперацыі прайшло каля двух тыдняў. Між тым вынікі першых-жа дзён паказваюць, што спажывецкая кааперацыя Магілеўшчыны не падрыхтавалася да правядзеньня важнейшай палітычнай кампаніі. 26 сельскіх спажывецкіх таварыстваў раёну дагэтуль не атрымалі ніякіх дырэктыў аб перавыбарах. Праўленьне райсаюзу абмежавалася тым, што дало ўказаньні спажыўтаварыствам, колькі кожнае з іх павінна выбраць дэлегатаў.

Дрэнная падрыхтоўка адмоўна адбілася на ходзе перавыбараў. У Махаўскім спажыўтаварыстве перавыбарчы сход зрываўся тры разы, а на чацьверты раз адбыўся пры ўдзеле 30 проц. пайшчыкаў. 17-га лістапада была склікана канфэрэнцыя пайшчыкаў Мастоўскага спажыўтаварыства, але-ж яна сарвалася з-за няяўкі дэлегатаў. Такі-ж выпадак меў месца ў Дасовіцкім таварыстве. Ні на адным са сходаў ня была пастаўлена справаздача рэвізійнай камісіі.

Райсаюз, добра ведаючы аб гэтым, не паліваў патрэбным скасаваць перавыбары ў тых сельсаветах, дзе зьявілася мала пайшчыкаў, дзе ня былі заслуханы даклады рэвізійных камісій.

Між тым, перавыбары спажывецкай сыстэмы па Магілеўшчыне набываюць асаблівае значэньне, у сувязі з вялікімі хібамі ў яе рабоце.

Асноўная дырэктыва аб 100 проц. каапераваньні калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў ня выканана. Плян каапераваньня другога кварталу выканан толькі на 12,8 проц., трэцяга—на 14,9 проц. Фінплян за кастрычнік выканан толькі на 21 проц. Ад сутнасьць жывога апэрацыйнага кіраўніцтва, уліку і кантролю па сыстэме прывяло да таго, што ў 13 сельспажыўтаварыствах ёсьць вялікія растраты як грашыма, так і прамтаварамі. За трэці квартал растрачана 14.284 руб. Большасьць растратчыкаў ня прыцягнута да адказнасьці. Кіруючыя кааперацыйныя арганізацыі не рэалізавалі па станоў партыі і ўраду аб ахове кааперацыйнай маемасьці.

Ні адно з спажыўтаварыстваў Магілеўшчыны не займаецца, як належыць, пяцілетнімі закупкамі. Некаторыя сельспажыўтаварыствы замест самазагатовак у глыбінных пунктах, ухітрыліся закупаць тавары ў крамах Белгандлю. Махаўскае сельспажыўтаварыства ў трэцім квартале закупіла мануфактуры на 2.500 руб. у крамах Белгандлю, зрабіўшы яшчэ свае пакупкі.

Характэрна нежаданьне раду таварыстваў гандляваць недэфіцытнымі таварамі. У Цішоўскім таварыстве, якое знаходзіцца ў 4-х кілёмэтрах ад гораду, доўгі час ня было нафты, у той час, як яе ёсьць шмат на базах райсаюзу. У гэтым-жа таварыстве, калі селянін жадае што-небудзь купіць, ён у нараду прымусовага асартымэнту павінен узяць некалькі тузін голак для прымусаў.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія — праверка перабудовы работы спажывецкай сыстэмы. Яна павінна быць праведзена пабаявому пры ўдзеле самых шырокіх мас пайшчыкаў.

Н. Нэйдлін, Н. Кунок.

Рабочыя брыгады пачалі праверку

Калектыў заводу імя Варашылава вылучыў спэцыяльныя брыгады, якія, разам з кааператывам і работнікамі прылаўку, пачалі праверку работы крамы ЗРК «Мэталіст», базы, прыгараднай гаспадаркі і сталоўкі. Арганізавана 6 брыгад для абсьледваньня ўсіх гэтых аб'ектаў.

Брыгада, якая абсьледуе краму № 2 ЗРК «Мэталіст», падзялілася на 4 групы, кожная з якіх вывучае паасобнае пытаньне. Брыгады арганізавалі збор прапаноў і скаргаў.

С. Е.

Як выконваецца пастанова ЦВК аб вышэйшай школе

(Па лістох студэнтаў)

Пастановай ЦВК аб сярэдній і вышэйшай школе вызначаны шляхі да карэннага палепшэньня якасьці навучаньня, да ўзьняцьця вядучай ролі прафэсарска-выкладчыцкага персаналу, да прамінальнай арганізацыі вытворчай практыкі, да забясьпячэньня індывідуальнай вучобы кожнага студэнта.

Але гэта пастанова ня стала яшчэ праграмай работы многіх ВНУ, на яе выкананьне некаторыя вузаўскія партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі не мабілізавалі выкладчыкаў і студэнцтва.

Вось што пішуць студэнты т. т. **Бекарэвіч, Войтка, Зіноўскі** аб выкладаньні дысцыпліны па біяфаку БДУ.

«НАГЛЯДАЮЦЦА ПРОПУСКІ ЛЕКЦЫЙ І СПАЗЬНЕНЬНІ НА ЛЕКЦЫІ З БОКУ НЕКАТОРЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ. НАВУЧАЛЬНЫ ПЛЯН ГЕНЭТЫЧНАГА АДДЗЯЛЕНЬНЯ ПАДЭКАДНА ВЫКОНВАЕЦЦА НЯ БОЛЬШ, ЯК НА 95 ПРОЦ.

АСАБЛІВА НЕЗАДАВОЛЕНЫ СТУДЭНТЫ БІЯФАКУ ВЫКЛАДАНЬНЕМ ПАЛІТЭКАНОМІІ, СУХОЕ ЦЫТАВАНЬНЕ МНОГІХ ПАДРУЧНІКАЎ, АДСУТНАСЬЦЬ У ВЫКЛАДАНЬНІ МАТАР'ЯЛУ ЖЫВЫХ ПРЫКЛАДАЎ, ЧАСТКОВАЯ НЕПАДРЫХТАВАНАСЬЦЬ ДА ЛЕКЦЫЙ, СЛАБАЕ ЎЛАДАНЬНЕ БЕЛАРУСКАЙ МОВАЙ ПРЫ ВОДЗЯЦЬ ДА ТАГО, ШТО БОЛЬШАСЬЦЬ СТУДЭНТАЎ БІЯФАКУ СЛАБА, НЕВЫС. ТАРЧАЛЬНА ЗАМАЦОЎВАЮЦЬ ВЕДЫ ПА ПАЛІТЭКАНОМІІ...

АЛЯПАВАТА ПРАХОДЗЯЦЬ ПРАКТЫЧНЫЯ ЛЕКЦЫІ ХЭМІІ ПРЫЛАДЫ І МАТАР'ЯЛ ДЛЯ ВОПЫТАЎ ЗАГАДЗЯ СЛАБА ПАДРЫХТОЎВАЕЦЦА, А ТАМУ Ў ЧАСЕ ЛЕКЦЫІ ПАЧЫНАЕЦЦА БЕГАТНЯ І Г. Д. СТУДЭНТЫ МАРНА ТРАЦЯЦЬ НЕКАЛЬКІ ГАДЗІН ЧАСУ».

Непадрыхтаванасьць часткі выкладчыкаў да лекцый — вялікае зло ў вышэйшай школе. Выкладчык, які ня рыхтуецца да заняткаў, ня ілюструе сваіх лекцый «прыкладамі з жыцьця» і наганяе на студэнтаў сон— бясспрэчна зрывае якасьць вучобы.

Ня можа быць ні аднэй вышэйшай, так і сярэдняй навучальнай установы, якаг-б працавала бяз цьвёрдага навучальнага пляну, без праграмы, бяз профілю спэцыяліста. Гэта зусім ясна. Між тым, у ВНУ зараз на трэцім месяцы навучальнага году, няма праграм.

— 12-я ГРУПА ШКЛЯНОЙ СПЭЦЫЯЛЬНАСЬЦІ БЕЛАРУСКАГА ХЭМІКА-ТЭХНАЛЁГІЧНАГА ІНСТЫТУТУ, — піша студэнт, — І ПА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ ПРАЦУЕ БЕЗ ПРАГРАМ.

СТУДЭНТЫ КОЖНЫ РАЗ НА ЗАНЯТКАХ ПА МЭХАНІЗАЦЫІ ЗАДАЮЦЬ ПЫТАНЬНЕ ПРАФЭСАРУ:

— ДЗЕ-Ж, НАРЭШЦЕ, ПРАГРАМЫ?

— ПРАГРАМЫ?.. ЁСЬЦЬ, Я ДАЎ ДАЎНО НАВУЧАЛЬНАЙ ЧАСТЦЫ. ДЗЕ БРЫГАДЗІР?

— ВЫ, ТАВ. БУХЦІЛАЎ? ДЫК ТРЭБА ЎЗЯЦЬ ГЭТЫЯ САМЫЯ ПРАГРАМЫ ДЛЯ СТУДЭНТАЎ.

ТАДЫ ЎСТАЕ БУХЦІЛАЎ І ДАВОДЗІЦЬ, ШТО ПРАГРАРМЫ БУДУЦЬ НАДРУКАВАНЫ ЗАЎТРА. І ГЭТА ЗАЎТРА ЦЯГНЕЦЦА ЎЖО КОЛЬКІ МЕСЯЦАЎ.

І ня толькі няма праграм па мэханіцы, іх няма і па дыялектычным матэрыялізьме.

— ТАВ. ВАЛАБРЫНСКІ ДАЎ НАМ УЖО НЕКАЛЬКІ ЛЕКЦЫЙ ПА ДЫЯЛЕКТЫЧНЫМ МАТЭРЫЯЛІЗЬМЕ. ДРУГІ ВЫКЛАДЧЫК ВЯДЗЕ СЭМІНАРЫ І ПАДАГУЛЬНЯЮЧЫЯ КАНФЭРЭНЦЫІ. ГЭТЫ САМЫ ВЫКЛАДЧЫК ВЕЛЬМІ ЧАСТА ПЫТАЕ Ў СТУДЭНТАЎ:

— ШТО ВЫ ПРАХОДЗІЛІ З ТАВ. ВАЛАБРЫНСКІМ ПА ДЫЯЛЕКТЫЧНЫМ МАТЭРЫЯЛІЗЬМЕ?

Студэнты ставяць да ведама выкладчыка, што яны прапрацавалі за апошнія дні.

— Я, ПА ПРАЎДЗЕ СКАЗАЦЬ, НЯ ВЕДАЮ, — шчыра прызнаецца выкладчык, — ШТО З ВАМІ ПРАПРАЦОЎВАЦЬ — ДЫЯЛЕКТЫЧНЫ МАТЭРЫЯЛІЗМ ЦІ ГІСТАРЫЧНЫ МАТЭРЫЯЛІЗМ. АЛЕ МЫ ГЭТА ПЫТАНЬНЕ ХУТКА ЎЗГОДНІМ З ВАЛАБРЫНСКІМ.

І гэта «ўзгадненьне» таксама цягнецца ўжо некалькі месяцаў.

«Праўда» ў перадавой у верасьні падкрэсьлівала, што ВНУ «бяз профілю» выпускаемых спэцыялістаў, гэта што карабель бяз старна». Адсутнасьць праграм не дае магчымасьці мець у навучальнай установе цьвёрда-ўстаноўленага і распрацаванага профілю.

Яшчэ горшае становішча ў **Беларускім Дзяржаўным Энэргетычным Інстытуце.** Інстытут працуе другі год і да гэтага часу ня мае распрацаванага профілю спэцыяліста. Мы ўжо аб гэтым у **«Зьвязьдзе»** пісалі не адзін раз, але становішча, як паведамляе студэнт тав. **Маслакоў** не зьмянілася да сёпешняга дня.

Адсутнасьць профілю прыводзіць да грубейшых скажэньняў прынцыпаў вытворчай практыкі.

Зусім ясна, што вытворчая практыка павінна разглядацца, як **сустаўная частка** навучальнага пляну і павінна дапаўняць агуль на-тэарэтычнае навучаньне. Інакш вытворчая практыка ператвараецца ў непатрэбнае марнаваньне часу студэнтаў, яна ня прыносіць ніякай карысьці.

— Студэнты трэцяга курсу Дзяржаўнага энэргетычнага інстытуту,—піша тав. Маслакоў, — выехалі на вытворчую практыку па сілавым мантажы. Яны там ужо працуюць колькі часу. Але яшчэ ня бачылі ў вочы матора. Працуюць на заводзе ў якасьці чорнарабочых.

Хіба ў такой практыцы можа быць якая-небудзь карысьць, калі студэнты замест працягу вучобы скарыстоўваюцца, як звычайныя рабочыя?

Кіраўніцтва УЭА цалкам нясе адказнасьць за такую «практыку» прымацаваных да яго навучальных устаноў.

Ня менш скажэньняў назіраецца ў арганізацыі рабочага дня студэнта.

Пастанова ЦВК зусім ясна гаворыць, што працяг рабочага дня ў ВТНУ, ВНУ, тэхнікуме, на малодшых курсах не павінен перавышаць 6 гадзін работы з выкладчыкам...

Тав. **Усоўскі** ў сваёй карэспандэнцыі ў «Зьвязду» аб становішчы рабочага дня ў інстытуце буйнай рагатай жывёлы і малочнай гаспадаркі піша:

«СТУДЭНТ ЗАНЯТ НА ПРАЦЯГУ 10 ГАДЗІН. ГЭТА ТЛУМАЧЫЦЦА ТЫМ, ШТО НАВУЧАЛЬНАЯ ЧАСТКА ІНСТЫТУТУ ДАЕ ПА 3 ДЫСЦЫПЛІНЫ КОЖНЫ ДЗЕНЬ З ГАДЗІННЫМ ПЕРАПЫНКАМ ПАСЬЛЯ КОЖНАЙ. ЗА ГАДЗІННЫ ПЕРАПЫНАК СТУДЭНТ НЯ МОЖА НІЧОГА ЗРАБІЦЬ І СКАРЫСТАЦЬ ЯГО ДЛЯ ВУЧОБЫ. РАБОЧЫ ДЗЕНЬ СТУДЭНТА ПАЧЫНАЕЦЦА Ў 9 ГАДЗІН РАНІЦЫ І ВЕЛЬМІ ЧАСТА ПРАЦЯГВАЕЦЦА ДА 8 ГАДЗІН ВЕЧАРА. ЗУСІМ НЕ ЗАСТАЕЦЦА ЧАСУ ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ЛЕКЦЫЙ. УСЯКІЯ РАЗВАЖАНЬНІ АБ РАЗГОРТВАНЬНІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА ПАМІЖ СТУДЭНТАМІ Ў ТАКІХ УМОВАХ ЗУСІМ ЛІШНІЯ»...

Такія барбарскія адносіны да выкарыстаньня часу студэнта ня могуць ня адбівацьці да сам

Безалькалёідны лубін

Улетку 1931 году Наркамзем СССР абвясціў ударную работу па адшуканьні безалькалёіднага лубіну па ўсёй сыстэме Усесаюзнай сельска-гаспадарчай акадэміі імя Ул. І. Леніна.

Першым штурмам для работы Менскай селекцыйнай станцыі па адшуканьні безалькалёіднага лубіну паслужыў прыезд працаўніка Усесаюзнага інстытуту Расьлінаводзтва (УІР'а) т. **Шарапава ў жніўні 1931 г.** Ка рыстаючыся рэактывам УІР'у, т. Шарапаў паказаў, што ў гаспадарчых пасевах вузкалістнага лубіну Менскай селекцыйнай станцыі ступень алькалёіднасьці вар'іруе.

У верасьні 1931 г. вопытным станцыям была разаслана інструкцыя УІР'а з указаньнем рэактыву, для адшуканьня безалькалёідных форм лубіну. Гэта інструкцыя паступіла і па Менскую селекцыйную станцыю. Досьледы, арганізаваныя станцыяй пры ўдзеле нашага супрацоўніка і супрацоўніка УІР'а т. **Фэдотава**, далі значныя посьпехі.

На працягу восені, зімы і вясны 1931-32 году **Менскай селекцыйнай станцыяй прааналізавана 450.000 паасобных расьлін лубіну. З гэтага ліку 300.000 аналізаў праведзена на самай станцыі і 150.000 у 7 калгасах Пухавіцкага раёну.** У верасьні і кастрычніку ў Дзяржынскім раёне працавалі 4 брыгады, якія прааналізавалі 100.000 паасобных расьлін па безалькалёіднасьці.

З гаспадарчых пасеваў вузкалістнага (сіняга) лубіну **на самой станцыі выдзелены тры расьліны безалькалёіднага лубіну і адна расьліна з меншай колькасьцю алькалёіду.** Работа па пошуках безалькалёідных форм лубіну ў саўгасах і калгасах БССР не дала чаканых рэзультатаў.

Частка эпойдэнага пасеньня ў ліку 9 зярнят перадана для размнажэньня УІР'у, а другая частка размнажаецца на самой станцыі.

Восеньню 1932 г. **Менскай станцыяй** зьнят першы ўраджай безалькалёіднага лубіну. **Ад аднаго зярнят атрымана 1.554 зярняты, агульнай вагой у 200,5 грам.** Ад аднаго зерня з меншай колькасьцю алькалёіду атрымана 213 зярнят, вагою ў 33,2 грам.

Такім чынам, у першы-ж год Менскай селекцыйнай вопытнай станцыяй узяты высокія тэмпы ў размнажэньні безалькалёіднага лубіну. **Кожнае зерне дало ўраджай у сярэднім больш 150 зярнят.** Гэтыя тэмпы ў далейшым будуць яшчэ павялічаны. Усё гэта дасьць магчымасьць у канцы другой пяцігодкі мець значныя плошчы безалькалёіднага лубіну на сацыялістычных палёх БССР і СССР.

Першы год размнажэньня безалькалёіднага лубіну дасьць ужо арыентовачныя матэр'ялы для складаньня пяцігодкі 1933—1937 году, фарсаванага размнажэньня безалькалёіднага лубіну.

Пры ўмацненьні забесьпячэньня Менскай селекцыйнай станцыі цяплічай і вэгетацыйным домікам, да 1937 г. можна мець ужо **тысячы га** пасеваў безалькалёіднага лубіну ў саўгасах і калгасах БССР.

Вузкалісны, горкі лубін, які зараз размнажаецца ў саўгасах і калгасах БССР, мае ў сярэднім да **1,5 проц.** алькалёіду, з прычыны чаго ён зьяўляецца нягодным непасрэдна для кармовых мэт. Толькі такія непатрабоўныя жывёліны, як авечкі, у невялікай колькасьці паядаюць у зялёным выглядзе лубін, але і яны вельмі часта пасьля гэтага захворваюць і пішуць у жудасных пакутах з усімі адзнакамі атручэньня.

Для так званых камбінаваных кармоў можа ўжываецца лубін, які мае ў сабе да **0,3 проц.** і нават да **0,5 проц.** алькалёіду ў зярных. Для гэтай мэты звычайны алькалёідны лубін апрацоўваецца ў спэцыяльных кормазапарніках, але пры гэтым ён трапіць да 25 проц. каштоўных спажыўных матэрый, у тым ліку і бялка.

Безалькалёідны **лубін Менскай селекцыйнай станцыі, паводле папярэдніх даных, мае каля 0,03 проц. алькалёіду**, прыблізна ў 10 раз менш дапушчанага яго зьместу ў камбікормах. Гэта дасьць нам магчымасьць выкарыстаць лубін, як зусім новую культуру, падобна соі, на харчаваньне людзей.

У разьвіцьці жывёлагадоўлі безалькалёідны лубін адыгрывае вялізарную ролю. Ён цалкам напоўніць дэфіцытны бялковы баланс у кармовым рацыёне. Тут трэба адзначыць, што ня толькі насеньне, але і сама расьліна безалькалёіднага лубіну зьяўляецца «салодкай», безалькалёіднай. Гэта дасьць нам вялікія магчымасьці для скарыстаньня безалькалёіднага лубіну на сілас.

Вузкалісны лубін, які размнажаецца менскай селекцыйнай станцыяй, мае ў зерні **каля 40 проц. бялка і больш 6 проц. тлушчу.** У гэтых адносінах ён наближаецца да соі. Высьпяваньне яго ў сярэдняй часьці Савецкага саюзу, дзе ёсьць лёгкія пясчаныя глебы, дае нам магчымасьць лічыць «салодкі» безалькалёідны лубін свайго роду «сояй» пясчаных глеб.

Па колькасьці бялкоў і тлушчаў лубін значна перавышае такія расьліны, як боб, гарох, віка і фасоль. Лубін мае прыблізна ў тры разы больш бялка ў параўнаньні з такімі збожжавымі злакавымі культурамі, як авёс, ячмень, жыта і пшаніца. Лубін багацей бялкамі нават за мяса сярэдняй якасьці.

Адзін га пасеву сіняга лубіну (пры сярэдняй ураджайнасьці ў 12 цэнт. зерня на га) дае прыблізна **3-4 цэнт. бялка і 0,7 цэнт. тлушчаў.** Адзін-жа га аўса (пры сярэдняй ураджайнасьці 8 цэнт. зерня на га) дае пры блізна 0,8 цэнт. бялка і 0,4 цэнт. тлушчу.

Такім чынам, **за 1 га пасеву лубіну можна сабраць прыблізна ў 4-5 раз больш бялка, чым з 1 га пасеваў аўса.**

Пры сярэдняй гадовай патрэбнасьці адной дарослай сьвіноматкі ў 85—100 клгр. бялка, адзін га пасеваў безалькалёіднага лубіну можа забясьпечыць бялкамі на працягу ўсяго году ня менш 4 дарослых сьвіна-матак. Аўса пры гэтых-жа ўмовах патрабавалася-б прыблізна адзін га на адну дарослую сьвіна матку.

Для правільнага кармленьня адной малочнай каровы, вагою ў 340 клгр. і пры сярэднім гадавым удоі ў 1.800 літраў, неабходна на год 90—100 клгр. бялка. Такім чынам, адзін га пасеваў безалькалёіднага лубіну можа ітаксама цалкам забясьпечыць 4-х кароў каштоўным канцэнтраваным кормам.

Безалькалёідны лубін, як вельмі багатая бяжамі расьліна, дапаможа ўстанавіць правільныя суадносіны паміж бялкамі і вуглеводамі (1:6) пры кармленьні жывёлы, што зьяўляецца зусім неабходным для павышэньня прадукцыйнасьці жывёлагадоўлі.

Апрача таго, іншыя вельмі каштоўныя якасьці звычайнага лубіну, як сідэрацыйнай культуры, поўнасьцю застаюцца і за «салодкім» безалькалёідным лубінам.

Неабходна адзначыць надзвычайную непатрабоўнасьць лубіну да глебаў, магчымасьць яго высьпяваць на вельмі бедных спажыўнымі матэрыямі, на сутнасьці бросавых землях. Ён ня толькі не пагаршае, але наадварот, паляпшае структурны стан бедных пясчаных і супясчаных глебаў. Гэта ня значыць, зразумела, што ў бліжэйшыя гады безалькалёідны лубін павінен быць кінут на бедныя спажыўнымі матэрыямі пясчаныя глебы.

Лубін надзвычай чулы на паляпшэньне глебы. На лепшых землях ён дае і лепшыя рэзультаты. Але яго непатрабоўнасьць да глебы дае нам права лічыць, што безалькалёідны лубін будзе ў стане асвоіць вялізарныя тэрыторыі новых зямель.

Распаўсюджаньне лубіну на насеньне абмяжоўваецца кліматычнымі фактарамі. У даны момант паўночная граніца ўстойлівага высьпяваньня вузкалістнага лубіну, у якім знойдзен і безалькалёідны лубін, праходзіць па цэнтральнай частцы БССР па лініі прыблізна—Менск—Быхаў і далей на Бранск.

З вывядзеньнем больш хуткасьпелых гатункаў безалькалёіднага лубіну паўночная граніца ўстойлівага высьпяваньня вузкалістнага лубіну на насеньне будзе значна адсунута на поўнач. Ужо і зараз, у паасобныя гады, лубін высьпявае па лініі Полацак — Смаленск. Але гэта не дае нам яшчэ права, як гэта робіць УІР, вырошчваць такі каштоўны ў даны момант безалькалёідны лубін ва ўмовах Ленінграду.

Лубін, як сідэрат, у даны момант займае вялізарныя тэрыторыі. Па аднай толькі частцы Савецкага саюзу — БССР мяркуецца мець у 1937 годзе 150.000 га лубіну на насеньне і 350.000 га на ўгнаеньне. З увядзеньнем у культуру безалькалёіднага лубіну, плошчы пад лубінам, як харчовым і кармовым прадуктам, будуць яшчэ больш вялікімі.

Такім чынам, замест горкага лубіну «салодкім», безалькалёідным адыграе вялізарную ролю ў разьвіцьці сацыялістычнай сельскай гаспадаркі Савецкага саюзу і БССР.

М. Савіцкі, Н. Пракапчук.

ПЕРАМАГЧЫ „ЛЯВАЦКУЮ" НЕДААЦЭНКУ АДНААСОБНАГА СЭКТАРУ

Ня зьвіжаючы тэмпаў здачы збожжа калгасамі, разгарнуць шырокую масава-агітацыйную работу за своячасовае і поўнае выкананьне самаабавязацельстваў бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі

29 лістапада

У агульна-рэспубліканскім збожжазагатоўчым плане ўдзельная вага аднаасобнага сэктару яшчэ вельмі значная (51 проц.). Тэмпы-ж загатовак у гэтым сэктары зусім нездавальняючыя. У той час, як калгасы МТС выканалі план на 99,1 проц., іншыя калгасы — на 73,2 проц., аднаасобны сэктар рэалізаваў сваё заданьне толькі на 54,6 проц. (без насеньпазыкі).

Гэта адставаньне аднаасобнікаў тлумачыцца тым, што ў радзе раёнаў вельмі слаба пастаўлена, а мясцамі зусім адсутнічае палітмасавая работа сярод беднякоў і сераднякоў. Партыя катэгарычна патрэбавала ўсе арганізацыі супроць «лявацкага» ігнараваньня ролі аднаасобнікаў у загатоўках збожжа і патрабавала мабілізацыі бядняцка-серадняцкіх мас на своячасовае і поўнае выкананьне іх самаабавязацельстваў перад дзяржавай.

І ўсё-ж знаходзяцца людзі, якія не разумеюць (або ня хочуць разумець) гэтай дырэктывы. Яны ідуць па лініі найменшага супраціўленьня і імкнуцца правесьці загатоўкі за кошт калгаснага збожжа, забываючы зусім аб арганізацыі загатовак у аднаасобным сэктары. Матар'ялы, якія мы сёньня друкуем, паказваюць, што ігнараваньне аднаасобніка — адна з асноўных прычын слабых тэмпаў збожжазагатовак, што гэта ігнараваньне ў радзе раёнаў прыводзіць да зрыву загатовак.

Характэрная рыса «левакоў» — гэта падмена масава-палітычнай работы голым адміністраваньнем у адносінах да беднякоў і сераднякоў. Замест таго, каб растлумачыць працоўным аднаасобнікам палітычна-гаспадарчую важнасьць своячасовай здачы збожжа дзяржаве, яны займаюцца камандваньнем, пагрозамі, давядзеньнем да сераднякоў цьвёрдых заданьняў.

За «левымі» загібамі хаваецца праваапартуністычная практыка. Яна праяўляецца ў недапушчальна слабым націску на кулацтва і катураньні кулацкім элемэнтам, у дапамозе ім утойваць збожжа, ігнараваць выкананьне цьвёрдых заданьняў. Толькі гэтым можна вытлумачыць той факт, што цьвёрдыя заданьні з кулакоў і саможнікаў па значнай частцы раёнаў і сельсаветаў спагнаюцца зусім нездавальняюча.

Задача раённых партыйных і савецкіх арганізацый — неадкладна дабіцца рэзкага пералому ў ходзе збожжазагатоўчай кампаніі. Не аслабляючы загатоўчай работы ў калгасах, неабходна рашуча ўзмацніць загатоўкі па аднаасобным сэктары. Задача заключаецца ў тым, каб шырока растлумачыць працоўным аднаасобнікам важнасьць перапачатковага выкананьня сваіх абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай. Кожны бядняк, кожны серадняк павінен ведаць, што толькі тады, калі дзяржаўны план загатовак будзе поўнасьцю выкананы, можна будзе прыступіць да гандлю збожжам, можна будзе рэалізаваць лішкі на рынку.

Трэба неадкладна і поўнасьцю спагнаць цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак. Ніякіх паблажак кулаку! Ніякіх адтэрміноўваньняў!

0,6 проц. за пяціднеўку

СЛУЦАК.

Апошнія пяціднеўкі характарызуюцца зьніжэньнем тэмпаў збожжазагатовак. За пяціднеўку з 15 да 20 лістапада прырост складае ўсяго 0,6 проц.

Адставаньне ідзе галоўным чынам за лік аднаасобнага сэктару і цьвёрдазаданьнікаў. У той час, як калгасы МТС выканалі план на 96,2 проц., іншыя калгасы—на 94,6 проц., аднаасобныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі рэалізавалі заданьне толькі на 66,8 проц. Цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак спагнаны ўсяго на 46,1 проц.

Па асобных сельсаветах процант выкананьня самаабавязацельстваў па аднаасобным сэктары яшчэ больш ніжкі. Так, па Даросінскім сельсавеце аднаасобнікі выканалі 30,2 проц. пляну, Сарагоўскім — 37,8 проц., Беліцкім — 34,3 проц.

Зусім іншы малюнак у тых сельсаветах, дзе аднаасобнаму сэктару было аддана максымум увагі, дзе работа была разгорнута як належыць. Да такіх сельсаветаў адносяцца: **Амговіцкі**, дзе аднаасобны сэктар выканаў 105,4 проц. заданьня, Першамайскі — **123 проц.** Вопыт гэтых сельсаветаў разьвівае ўшчэнт апаргуністычныя разважаньні аб нерэальнасьці плянаў, аб немагчымасьці іх выкананьня.

Нядаўна ў Івана-Гародніцкім сельсавеце адбыўся зьлёт ударнікаў загатовак. Гэты зьлёт паказаў лішні раз, што раён не выкарыстоўвае ўсіх форм масавай работы па загатоўках. За час правядзеньня зьлёту процант выкананьня пляну па сельсавеце ўзрос да 85. Ударнікі загатовак Івана-Гародніцкага сельсавету паслалі буксірную брыгаду ў адстаючы Беліцкі сельсавет.

Я. Траяноўскі.

Прэміі за... няздачу збожжа

ЛЮБАНЬ. Збожжазагатоўкі па Любаньскім раёне праходзяць вельмі павольна. На 20 лістапада гадавы план выкананы на 69 проц., прычым аднаасобнікі здалі каля 60 проц.

Асабліва адстае Ніжынскі сельсавет, які замест 529 цэнтн. здаў 120 цэнтн., або 46%.

Гэты сельсавет за апошнюю пяціднеўку павысіў тэмпы здачы збожжа толькі на 1,6 проц.

Лічбы гавораць аб адсутнасьці ўсякай работы па загатоўках у Ніжынскім сельсавеце, аб курсе на самацёк, які не ліквідован дагэтуль.

Трэба падкрэсьліць зусім слабы націск па раёне на кулацка-заможныя гаспадаркі.

Амаль ні адзін з членаў Тальскага сельсавету поўнасьцю ня выканаў сваіх самаабавязацельстваў. Цікава, што некаторыя з іх прэміяваны за... збожжазагатоўкі. Старшыня сельсавету кажа: «Мы даем прэмію не за выкананьне самаабавязацельстваў, а за актыўную работу». Хіба можа праводзіць актыўную работу сельсаветчык, які сам не паказвае ўзору выкананьня сваіх абавязкаў перад дзяржавай? Такіх членаў сельсавету трэба зьнімаць з работы, а не прэміяваць.

Т. Вяроўка, П. Сьвінка.

Збожжа затрымліваецца ў глыбінных пунктах

СТАРОБІН. Некаторыя сельсаветы адкладаюць загатоўку збожжа ў сувязі з тым, што «яны заняты адгрузкай бульбы». У Сухамільскім сельсавеце каля двух тыдняў ляжала ў краме 5 тон збожжа і за гэты час яно не накіроўвалася на ст. Слуцак. Старшыня сельсавету **Лазоўскі** ня прымае ніякіх мер супроць затрымліваньня збожжа ў глыбінных пунктах.

Чырвона-Дворскі сельсавет займае рашаючае месца ў раённым збожжазагатоўчым пляне, але кіраўніцтва гэтага сельсавету замест мабілізацыі мас на пасьпяховае выкананьне збожжазагатовак, замест разгортваньня масава-палітычнай работы сярод беднякоў і сераднякоў — аднаасобнікаў, займаецца адміністраваньнем і пагрозамі.

Апартуністычную бязьдзейнасьць у загатоўках праявіў старшыня Дзяковіцкага сельсавету **Чэркес.** Ён адкрыта заявіў: «Я і ня думаю выканаць план здачы збожжа». Бюро РК КП(б)Б і прэзыдыум РКК зьнялі Чэркеса з работы і выключылі яго з радоў КП(б)Б.

(Белта).

Марынуюць пяты месяц

(Ліст рабочага вылучэнца)

Да кастрычніка мінулага году я працаваў на гомельскім элеватары. У кастрычніку мяне, як ударніка, партыйная і прафсаюзная арганізацыі вылучылі на курсы сьледчых пры Наркамюсьце БССР. На курсах я падаў заяву ў бюро партыйнай ячэйкі аб прыёме мяне ў партыю. Пасьля разгляду маёй заявы на агульным партыйным сходзе, бюро парт'ячэйкі перадала мой матар'ял у Менскі гарком КП(б)Б.

1-га мая бягучага году я скончыў курсы і быў накіроваН на работу сьледчага ў гор. Мазыр. З тае прычыны, што мяне ў Менску ня было, Менскі гарком КП(б)Б пераслаў мой матар'ял у Мазырскі райком партыі. Там у раённай прыймовай камісіі гэты матар'ял праляжаў два тыдні і невядома па якіх прычынах быў накіраван у савецкую парт'ячэйку.

Прайшло больш пяці месяцаў, а справа аб прыёме мяне ў партыю да гэтага часу ня вырашана. Матар'ялы, дасланыя ў ячэйку, і на сёньняшні дзень ляжыць у папках сакратара ячэйкі **Ланцмана.** На мае запытаньні, чаму бюро ячэйкі не разглядае маёй заявы, тав. Ланцман нічога ня хоча адказваць. Я ўжо зварачаўся са скаргай і да работнікаў Мазырскага райкому партыі, у прыватнасьці да тав. Кардаша, але рэзультатаў таксама ніякіх не дабіўся.

Фэльдман.

Члены праўленьня—кулакі ды заможнікі

(Ліст калгасьніка)

У калгасе «Парыская Камуна», Пушчанскага сельсавету, Дзяржынскага раёну, праўленьне складаецца з заможнікаў. Старшыня калгасу **Квяткоўскі** — моцны серадняк. Да 1931 году ён меў цьвёрдае заданьне, але разбазарыў маемасьць і пралез у калгас. Другі член праўленьня **Куль Ф.** да ўступленьня ў калгас на працягу 7 год трымаў батракоў і сэзонных рабочых. Кладаўшчык Казанковіч у 1931 годзе меў цьвёрдае заданьне.

У калгасе няма гаспадарчых адносін да арамаджанай маемасьці. Сьвіньні знаходзяцца ў дрэнным становішчы, стаяць у хлеве па вушы ў гразі. Адпускаецца харч для сьвіней толькі... на паперы. Ніхто з праўленьня не зварачае на гэта ўвагі.

Многа раз пісалася аб злачынстве, што праяўляецца з боку кулакоў, якія пралезлі ў калгас і імкнуцца падарваць яго з сярэдзіны. Але ня было зьвернута на становішча калгасу належнай увагі ні з боку Пушчанскага сельсавету і парт'ячэйкі, таксама і з боку Дзяржынскага РКС, РВК, пракуратуры і інш. раённых арганізацый.

Праўленьне імкнецца выціснуць беднату з калгасу. Напрыклад, бядняжам Калантай Адэлі і Сакалоўскай ня ўлічвалі правільна працадні. Выдавалі ім авансам не такое збожжа, якое атрымліваў Квяткоўскі і яго кампанія, а больш дрэнная якасьці.

Паводле загаду загадчыка гаспадаркі Гарбатоўскага, 1 кастрычніка бягучага году ў калгасе зарэзалі дзьве штукі пародзістага маладняка і праўленьне вывезла на рынак.

Калгасьнік.

Пільна ахоўваць калгасную маемасьць

(Агляд лістоў)

Са дня надрукаваньня пастаноў **ЦВК СССР і ЦВК БССР аб ахове калгаснай маемасьці** прайшло даволі часу для таго, каб гэтыя пастановы сталі вядомы кожнаму калгасьніку, сталі пунктам апоры ў барацьбе з пакражамі.

Але аб іншым кажуць лісты калгасьнікаў, якія штодзенна паступаюць у рэдакцыю. Яны кажуць, што яшчэ шмат дзе пастанова ЦВК ня стала балывм сьцягам у барацьбе з раскрадваньнем калгаснай маемасьці.

Піша калгасьнік з **Церахаўскага раёну:**

«У калгасе **«Кастрычнік», Пракапоўскага** сельсавету, украдзена некалькі тон збожжавых культур. Невядома куды дзелісь: 2 кані, 41 шт. парасят, 227 руб. грошай».

Ён-жа называе прозьвішчы зладзеяў:

«Першы, гэта старшыня калгасу **Лорчык П.** Ён зьвішчыў ведамасьці на выдачу жыта, з мэтай утаіць злачынства.

Памочнікамі Лорчыка ў раскрадваньні былі: **Рэпікаў** і **Лаўрэнчук.** Гэта кампанія вазіла збожжа ў млын бяз усякага ўліку і прадавала муку на базары, прысвойваючы грошы. Такім машэньніцтвам было прадана **600 пудоў** мукі».

Аб тым, што гэта праўда, калгасьнік прыводзіць такі доказ:

«Аднойчы блізкі сябра **Лорчыка** па раскрадваньні калгаснага збожжа — Япоўскі, будучы п'яным, хвалёўся: «я перавёз на базар 600 пудоў калгаснага збожжа».

Калгасьнікі з **«Кастрычніка»** ведаюць, хто крадзе іх маемасьць і ня раз паведамлялі ў адпаведныя арганізацыі. Але іх сыгналы ня ўнесьлі зьмен у жыцьцё калгасу. Шайка зладзеяў арудуе і зараз.

«У калгасе **«Свабода», Старобінскага раёну,** — піша т. Піскун, — калёсы, лепшая збруя раскрадзены. Вартаўнік калгасу сам дапамагае зладзеям раскрадваць калгасную маемасьць».

І яшчэ:

«У калгасах **Хоцькаўскага сельсавету, Чавускага раёну,** — пішуць калгасьнікі,— з прычыны злачынкай нядбайнасьці кіраўніцтва калгасаў німат ураджаю загінула на полі. У калгасе **імя Сталіна** згноена 14 воп сена, паўтара га канапель, зьнішчан ураджай ільну з 7 га.

У калгасе **імя Леніна** абсыпалася на полі перасьпеўшая цімафееўка. Загінуў пасеў канапель».

Аўтары называюць яшчэ некалькі калгасаў, у якіх загінула частка ўраджаю.

Адным з мэтадаў кулацкага шкодніцтва трэба лічыць зьнішчэньне ўраджаю.

Характэрна адзначыць, што ва ўсіх прыведзеных вытрымках указваецца на ўдзел калгаснага кіраўніцтва ў пакражах. Гэта яшчэ раз пацьвярджае, што па падбор кіруючага складу калгасаў мала зварачаецца ўвагі.

Адсутнасьць, заблытанасьць калгаснага рахункаводзтва — заслона, за якою зладзеі робяць свае драпежніцкія справы.

Падбор вартаўнікоў калгасаў у радзе выпадкаў робіцца няправільна. На гэту адказную работу часта трапляюць зладзеі і іх дапаможнікі.

Раскрадваньню калгаснай маемасьці спрыяе адсутнасьць хуткага і рашучага рэагаваньня на кожнае асобнае злачынства з боку сельсаветаў, раённых арганізацый і асабліва судова-сьледчых органаў.

Калгасная маемасьць сьвяшчэнна і недатыкальна. Трэба добра памятаць гэта, трэба сурова караць тых хто пасягае на гэту маемасьць, і хто ня хоча зауважаць злачынстваў, хто сваёй кляславай сьлепатой патурае нашым ворагам.

Г. Самусевіч

Сацыялістычнай сьвінагадоўлі—уласную кармовую базу

Посьпехі, якіх БССР дабілася ў галіне сацыялістычнай сьвінагадоўлі, бясспрэчныя. На сёньняшні дзень мы маем 130 сьвінагадоўчых саўгасаў з агульным стадам сьвіна-маткаў 105 тыс.; арганізавана 2.200 сьвінагадоўчых калгасных таварных фэрм са стадам у 185 тыс. сьвіна-маткаў. Лічбы кажуць самі за сябе.

Побач з гэтым трэба адзначыць, што як па саўгасах, так і СТКФ ёсьць яшчэ вельмі вялікі адыход парасят, у выніку чаго па значнай частцы гаспадарак недавыконваецца плян адкорму сьвіней і здачы таварнай прадукцыі дзяржаве. Гэта самы галоўны недахоп. Ён зьяўляецца вынікам таго, што па саўгасах і СТКФ не хапае ўласнай кармовай базы, што ў значнай ступені тармозіць пасьпяховую гадоўлю і адкорм сьвіней.

Менскі навукова-дасьледчы інстытут сьвінагадоўлі, падводзячы вынікі праведзенай спэцыялізацыі саўгаснага і калгаснага будаўніцтва, павінен адкрыта прызнаць, што пры плянаваньні дапушчаны памылкі і перагібы, якія павінны быць неадкладна выпраўлены.

Бясспрэчна, што сацыялістычная плянавая гаспадарка павінна будавацца выходзячы з прыняцьця спэцыялізацыі, бо спэцыялізацыя дае магчымасьць больш правільна расставіць вытворчыя сілы і найхутчэй аўладаць працэсамі і тэхнікай вытворчасьці. Спэцыялізацыя забясьпечвае найвышэйшыя колькасныя і якасныя паказальнікі.

Гэта мы вельмі выразна наглядаем у прамысловасьці. Аб гэтым сьведчаць і посьпехі саўгасна-калгаснага будаўніцтва. Аднак, практыка спэцыялізаваных калгасаў і саўгасаў паказвае, што мэханічнае перанясеньне мэтадаў плянаваньня сацыялістычнай прамысловасьці на калгаснае і саўгаснае будаўніцтва прыносіць мала карысьці. Напрыклад сьвінагадоўчых саўгасаў мы асабліва ясна бачым, як вельма скажаны прынцыпы спэцыялізацыі, не ўлічваючы становішча ўсёй народнай гаспадаркі (транспарт, хэмічная прамысловасьць, уз'ядненьне тэхнікі, кадры і г. д.)

Як правіла, пры арганізацыі саўгасаў і СТКФ мала лічыліся з зямлязабясьпечанасьцю гэтых гаспадарак і лапускалі, што на адну сьвіна-матку зусім даволі 2 га зямлі. Пры гэтым лічылі, што збожжавыя кармы ў асноўным павінны быць завезены з-за межаў БССР.

У выніку такой «спэцыялізацыі» нашы сьвінасаўгасы і часткова СТФК заставаліся ў 1931-32 годзе бяз збожжавых кармоў. Гэта паўтарэцца і ў 1932-33 годзе. Вынікі бясспрэчныя: сьвіней усім вядомы. Мы маем вялікую страту сьвінога паголаўя. Для забясьпячэньня-ж уласнымі збожжавымі, сакавітымі і грубымі кармамі неабходна ў саўгасах і калгасах на адну сьвіна-матку мець ад 4 да 6 га зямлі.

Яшчэ ў сакавіку 1932 году эканамічная нарада пры СНК БССР на дакладу НДІ сьвінагадоўлі абавязала ўсе сьвінасаўгасы і калгасы забясьпечыць сваё стада сьвіней поўнасьцю сакавітымі і грубымі кармамі, а таксама забясьпечыць у асноўным і збожжавымі кармамі.

Гэта пастанова абавязала адпаведныя сьвінатрэсты і калгасную сыстэму, пачынаючы з вясны 1932 году, значна перабудаваць сваю работу ў напрамку большага пасеву збожжавых культур і прывядзеньня кармовай базы ў адпаведнасьць з наяўным стадам сьвіней.

На жаль, замест бальшавіцкага выкананьня пастановы ЭКАНА, сьвінатрэсты пайшлі па іншым шляху: пачалі падазраваць саўгасы на дзьве-тры гаспадаркі, а забясьпечанасьць зямлёй засталася тая-ж самая. На набудову новых саўгасаў затрачана шмат сродкаў, а стада сьвіней засталося бяз збожжавых кармоў.

Толькі за апошні час, калі і сьляпому стала відаць, што завозных кармоў ня будзе,—сьвінатрэсты сталі на шлях зьмяншэньня стада, што ў сваю чаргу азначае зьмяншэньне ў далейшым здачы таварнай прадукцыі дзяржаве. Апошнія мерапрыемствы якраз для нас і непажаданыя.

Што-ж трэба зрабіць для таго, каб у максымальнай ступені захаваць стада сьвіней у сацыялістычным сэктары? Каб правільна вырашыць гэта пытаньне, трэба мець неабходныя матар'ялы аб кармовых рэсурсах рэспублікі наогул і кармовых рэсурсах усіх баз выключэньня саўгасаў, у прыватнасьці. На жаль, гэтых матар'ялаў у выстарчальнай ступені мы ня маем.

Аднак, тыя матар'ялы, якія ў нас ёсьць, даволі грунтоўна кажуць аб тым, што першым крокам да папярэджаньня вялікіх страт па сьвінагадоўлі, для лепшага наладжваньня сьвінагадоўчай вытворчасьці, павінна быць адмаўленьне ад так званай «вузкай спэцыялізацыі». Гэта азначае, што трэба ўсіх лішніх сьвіней перавесьці са сьвінагадоўчых саўгасаў, дзе не хапае кармоў і дзе кармовая база не адпавядае агульнаму стаду сьвіней, у тыя саўгасы, якія больш-менш забясьпечаны кармамі, ня лічачыся з іх спэцыялізацыяй.

На гэта нам могуць сказаць «вузкія спэцыялізатары», што лепш перакінуць кармы да сьвіней, чым перакідваць сьвіней да кармоў. У адказ на гэта мы можам прывесьці прыклад з жыцьцёвай практыкі: апошнія два гады «вузкія спэцыялізатары» перакідвалі кармы, а тымчасам сьвіньні здыхалі.

Возьмем кармовыя рэсурсы Менскага сьвінаводтрэсту. Для 8.000 сьвіней, якія мяркуюцца пакінуць у саўгасах Менскага трэсту (замест раней разлічаных 17.000 сьвіна-маткаў), патрабуецца кармоў: збожжавых 264 тыс. цэнтн., а ёсьць 55,5 цэнтн., або 21 проц. патрэбы, сакавітых патрэбна 408 тыс. цэнтн., а ёсьць 593 тыс. цэнтн.—лішак складае 185 тыс. цэнтн.; грубых кармоў патрэбна для ўсёй жывёлы сьвінасаўгасаў 213 тыс. тон, а ёсьць 290 тыс. тон—лішак 77 тыс. тон.

Бясспрэчна, што ў іншых спэцыялізаваных саўгасах (жывёлагадоўчых) неадпаведнасьць ня хапае сакавітых і грубых кармоў і ёсьць лішкі збожжавых і канцэнтраваных кармоў, якія якраз з посьпехам маглі-б быць скарыстаны для гадоўлі сьвіней.

Возьмем для прыкладу ільнаводчую гаспадарку. Там звычайна глеба добрая, ужываецца пасеў канюшыны, значыць ёсьць магчымасьць трымаць шмат кароў, а на малочных адкідах вырошчваць пэўную колькасьць парасят. Такім чынам устанаўліваецца сувязь сьвінагадоўлі з ільнаводствам. Праўда, у ільнаводчых гаспадарках збожжавыя культуры будуць сеяцца ў абмежаваных разьмерах і таму там ня будзе магчымасьці весьці поўнасьцю адкорм сьвіней. Але гэта і непатрэбна. Ільнаводчыя гаспадаркі могуць сваю ільнаводчую прадукцыю здаваць у маладым узросьце, г. зн. парасятамі.

Такім чынам, можна прысьці да вываду, што ў поўных разьмерах неабходна трымаць сьвіней ва ўсіх спэцыялізаваных гаспадарках. Разьмер сьвінагадоўлі ў гэтых гаспадарках вызначаецца ўнутранымі кармовымі рэсурсамі кожнай гаспадаркі ў адсотку. І маладняк г. зн. у сьвінагадоўчых спэцыялізаваных саўгасах трэба мець большую колькасьць рагатай жывёлы, чым ёсьць у цяперашні момант. Гэта дасьць магчымасьць з аднаго боку правільна скарыстаць лішкі сакавітых і грубых кармоў сьвінасаўгасаў, а з другога—скарыстаць канцэнтраваныя кармы (малочныя адыходы) для парасят.

Чым хутчэй гэта праблема будзе практычна вырашана, тым лепш мы аздаравім і забясьпечым правільнае разьвіцьцё сацыялістычнай сьвінагадоўлі.

Другой ня менш важнай праблемай у сьвінагадоўчых саўгасах і калгасах зьяўляецца праблема павышэньня ўраджайнасьці і на гэтай аснове павялічэньня сьвінога стада.

Першае, на чым трэба сканцэнтраваць увагу ўсёй грамадзкасьці — гэта праца МТС. Пытаньне якасьці апрацоўкі глебы мы павінны рубам паставіць перад кожнай машына-трактарнай станцыяй. Невыпадковы заявы сялянкі, якая, нібы жартуючы, кінула рэпліку: «ураджай пазнішуся таму, што трактары паціса валі зямлю». Недарма ў калгасе імя Дзяржынскага, пад Менскам, на другі-ж дзень пасьля работы трактарнай калёны давялося далікатна папрасіць трактарыстаў з поля, таму, што трактарная калёна не забясьпечыла добраякаснай апрацоўкі глебы.

МТС важнейшы сродак нашай палітыкі ў рэканструкцыі сельскай гаспадаркі,—будучы ў дрэнных руках, становіцца супроць нас.

Возьмем другі факт. Большасьць трактараў на саўгасах фактычна не працуюць, у выніку чаго пасеў праводзіцца несваячасова. Гэта зьявішча атрымліваецца таму, што на падбор і на падрыхтоўку трактарыстаў зварочваецца мала ўвагі. Ня ўсе саўгасы, ня ўсе трактарныя калёны забясьпечаны падрыхтаванымі мэханікамі і брыгадзірамі. А яны-ж зьяўляюцца камандзірамі на палёх і для іх пельга шкадаваць сродкаў.

Трэба з усёй сілай падкрэсьліць, што пакуль мы, як сьлед, не наладзім работы трактарных калён, пакуль не дабіемся таго, што МТС стануць арганізатарамі і ініцыятарамі ўкараненьня агратэхнікі,—датуль мы ўраджай насьці ня ўзьнімем.

Для сьвінагадоўчых саўгасаў і калгасаў рашаючым момантам ва ўзьнікьці ўраджайнасьці зьяўляецца севазварот.

Нам трэба падабраць такія культуры, якія-б забясьпечылі стада сьвіней кармамі яш толькі ў стойлавы перыяд, а і ў летні час, калі сьвіньні пасуцца.

Асноўнымі культурамі для стойлавага перыяду ва ўмовах БССР да апошняга часу лічылі: абожжавыя—ячмень, авёс, жыта; сакавітыя—бульба і каранплоды і зялёныя, на сілас і сена—віка, кукуруза і інш. Для пашы: віка, авёс, канюшна, сэрадэла і інш.

Аднак, ня ўсе паказаныя культуры аднолькава падыходзяць да корму сьвіней як з боку спажыўных матэрый, так і па тэхніцы іх скармліваньня.

Менскі НДІ сьвінагадоўлі займаецца вывучэньнем пытаньня, якія культуры ва ўмовах БССР дадуць найбольшую эканамічную эфэктыўнасьць пры скармліваньні іх сьвіньнямі.

Інстытуту ўдалося падабраць рад культур, якія адкавядаюць наступным запатрабаваньням сьвінагадоўчай вытворчасьці: 1) забясьпечваюць зялёнай пашай з раньняй вясны да позьняй восені; 2) на сваёй спажыўнасьці даюць мэтчымасьць скараціць дачу збожжавых кармоў; 3) з аднаго пасеву даюць параўнальна большую колькасьць спажыўных матэрый; 4) пры пашы пасевы ня ўтоптваюцца сьвіньнямі і 5) агратэхніка іх простая і непрапаёмк

ПРЭЧ ФАШЫСЦКІ ТЭРОР!

Напярэдадні працэсу тав. Тарашкевіча

Фашысцкі акт абвінавачаньня

ВІЛЬНЯ, 27. Амаль два гады патрабавалася польскай дэфэнзыве, каб пры дапамозе сваіх верных лёкаяў — беларускіх нацыянал-фашыстаў сфабрыкаваць сякі-такі акт абвінавачаньня супроць тав. Тарашкевіча. У чым-жа абвінавачваецца тав. Тарашкевіч?

Паслухаем, што кажа аб гэтым фашысцкая прэса. Орган віленскіх пілсудчыкаў «Кур'ер віленскі» ад 27 лістапада (найбольш паінфармаваны ў гэтай справе), паведамляючы, што 28 лістапада ў віленскім акруговым судзе пачнецца працэс т. Тарашкевіча, падае наступныя вытрымкі з акту абвінавачаньня:

«Прабыўшы некаторы час на свабодзе пасьля датэрміновага вызваленьня з турмы, Тарашкевіч потым выехаў у Данцыг і тут завязаў сувязі з былымі паслами беларускага клюбу «Змаганьне» — Грэцкім і Верамеем, якія пасьля роспуску сойму, баючыся арышту, уцяклі з Польшчы.

Гэта тройка потым наладзіла кантакт з б. паслом Ваявуцкім. Пасьля назначэньня новых выбараў у сойм, гэтыя паслы з Данцыгу арганізавалі і кіравалі выбарчай кампаніяй клюбу «Змаганьне», ствараючы выбарчы сьпіс № 8. Самым актыўным дзеячом быў Тарашкевіч.

Тарашкевіч арганізаваў на Віленшчыне рад агітацыйных пляцовак, дзе на павелічах фабрыкаваліся адозвы. У гэтых адозвах Тарашкевіч паведамляў сваіх палітычных прыяцеляў, што яго вызвалілі з турмы з мэтаю «ашуканьня мас», заклікаў да барацьбы за нацыянальнае вызваленьне Заходняй Беларусі, **ВЫСТУПАЎ ВОСТРА СУПРОЦЬ БЕЛАРУСКАЙ ГРУПЫ АСТРОЎСКАГА** (падкрэсьленьне нашае. — Рэд.).

У студзені 1931 г. Тарашкевіч у часе праезду з Бэрліну ў Маскву праз «калідор» быў арыштаваны ў Тчэве ў транзітным нямецкім цягніку камісарам Скальскім пад фальшывым пашпартам.

Разам з Тарашкевічам на лаве падсудных Пётра Бакач, Аляксандр Лябецкі, Барыс Махляр, Уладзімер Лебка і Міхась Рэшэтаў.

Тарашкевіч і таварышы абвінавачваюцца па 100 і 101 арт. царскага КК, якія прадбачаць кару ДА 10 ГОД КАТАРГІ.

Абараняе Тарашкевіча адвакат Дурач з Варшавы, рэшту падсудных — адвакаты Хіль, Сукеніцка і інш. з Вільні.

Абвінавачвае пракурор Міхайлоўскі. Суд складаецца — з старшыні Бжазоўскага, судзьдзяў — Ліманоўскага і Ахматовіча.

На расправу з боку абвінавачаньня выклікана 15 сьведак, галоўным чынам, сышчыкаў. Галоўным сьведкаю зьяўляецца начальнік аддзелу міністэрства ўнутраных спраў — Бах. «Працэс працягнецца некалькі дзён».

Вось што піша фашысцкі «Кур'ер віленскі» адносна акту абвінавачаньня.

«Калі мы тут у вастрозе разам з лепшымі прадстаўнікамі пралетарыяту, прадстаўнікамі польскіх і яўрэйскіх працоўных мас змагаемся проці жорсткага вастрожнага рэжыму, змагаемся за сваё існаваньне,—у той-жа час Астроўскія, Луцкевічы, Акінчыцы, Станкевічы братаюцца на банкетах з палачамі працоўных мас Зах. Беларусі».

(З «Заклику» Тарашкевіча і Валошына).

Як бачым з гэтага, ня гледзячы на мабілізацыю ўсяго фашысцкага апарату, на двух гадовае стараньне дэфэнзывы і яе верных служак — **Астроўскіх, Луцкевічаў, Акінчыцаў і К°**, акт абвінавачаньня ня вытрымлівае нішкай крытыкі. Ён увесь пабудаваны на пяску.

На падставе гэтых вытрымак акту абвінавачаньня бачым, што фашызм зьбіраецца судзіць Тарашкевіча зараз за тое, што ён кіраваў выбарчай кампаніяй у сойм беларускіх працоўных мас, што ён пісаў адозвы да працоўных ЗБ, дзе выкрываў манэўры польскага фашызму ў сувязі з датэрміновым яго вызваленьнем, што ён заклікаў працоўныя масы да барацьбы за свае правы і нарэшце, што ён выступаў супроць прадажных псоў, агентаў дэфэнзывы — групы Астроўскага.

Сапраўды, толькі гапебны правал шпчэк фашысцкага правасудзьдзя, поўны правал яго агентаў — беларускіх нацыянал-фашыстаў прымусілі фашызм выступіць з такімі абвінавачаньнямі т. Тарашкевіча. Фашызм ня мае адвагі выступіць адкрыта перад шырокімі масамі і сказаць, у чым ён сапраўды абвінавачвае Тарашкевіча. Фашызм баіцца прызнацца перад працоўнымі ўсёй Польшчы, што ён кінуў за краты Тарашкевіча і зараз зьбіраецца судзіць за тое, што **Тарашкевіч не хацеў панскай ласкі, не хацеў прадаваць працоўныя масы ЗБ, якія і так гібеюць пад уладай акупантаў, што ён шчыра абараняў правы беларускіх працоўных мас, беларускага народу на яго існаваньне.**

Зьмяшчаючы такую бязглузьдзіцу ў якасьці довадаў абвінавачаньня супроць Тарашкевіча, фашызм стараецца выратаваць свой твар, стараецца пусьціць пыл у вочы працоўным масам, каб утаіць перад імі сапраўдную прычыну сваёй расправы над Тарашкевічам.

Але дарэмна. Гэта фашызму ня ўдасца.

Пратэст пісьменьнікаў БССР

Польскія фашысты ў саюзе з нацыянал-фашыстамі Заходняй Беларусі давялі да куль мінацыйнага пункту жахлівы, разьюшаны наступ на нацыянальна-вызваленчы рух Заходняй Беларусі. Тысячы працоўных мас няпшадна эксплёатуюцца фашысцкімі катамі, лёкаямі капіталізму. Сотнямі турмаў — драпежных засьцепкаў буржуазіі, польскі фашызм думае стрымаць вялікія рэвалюцыйныя хвалі працоўных мас Заходняй Беларусі ў іх барацьбе пад кіраўніцтвам КПЗ і КПЗБ за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне. Для гэтай мэты азьвярэлы фашызм ня грэбуе самымі агіднымі мэтадамі: забойства з-за вугла, сярэднявяковыя катаваньні, подкуп і правакацыя, фальшыўка і разгром рэвалюцыйных арганізацый, высылка тысяч ні ў чым невінаватых жыхароў з ЗУ і ЗБ, разгром ТБШ і ўсіх нацыянальна-культурных арганізацый, ліквідацыя беларускіх школ, гімназій, крывавая пацыфікацыя.

Але-ж гэта сьведчыць толькі аб бясьсільлі крывавых катаў, аб набліжэньні апошняга часу дыктатуры бізуна і шыбеніцы — атрыбутаў «заходняй цывілізацыі». Не запалохаць рабочую клясу і рэвалюцыйных сялян Заходняй Беларусі, не запалохаць гераічны авангард рабочае клясы — камуністычную партыю ЗБ і ЗУ, ні шалёным тэрорам, ні правакацыямі.

З вялізарнейшым абурэньнем сустракаюць працоўныя масы Беларусі новую камэдыю суда над лепшым прадстаўніком працоўных мас ЗБ **тав. Браніславам Тарашкевічам** — былым старшынёю стотысячнай рабоча-сялянскай Грамады. Пераапранутым у судзейскія мундзіры катам і жандарам ня ўдасца схаваць клясавую сутнасьць гэтай камэдыі. «Правасудзьдзе» фашыстаў добра вядома працоўным масам.

Мы, пісьменьнікі Савецкай Беларусі, падымаем свой голас, голас абурэньня і пратэсту супроць камэдыі суда над Браніславам Тарашкевічам. Мы патрабуем яго вызваленьня.

Мы заклікаем пісьменьнікаў усяго сьвету, усіх тых, каму дорага справа вызваленьня эксплёатуемых і прыгнечаных — далучыць разам з намі свой голас да пратэсту мільённых мас рабочых і сялян БССР у абарону Тарашкевіча.

Прэч фашысцкі тэрор!

Волю вязьням капіталу! Волю змагару за вызваленьне працоўных мас — Браніславу Тарашкевічу!

Я. КУПАЛА, Я. КОЛАС, А. АЛЕКСАНДРОВІЧ, М. АЛЯХНОВІЧ, З. АКСЕЛЬРОД, С. БАРАНАВЫХ, М. БАГУН, П. БРОЎКА, Хв. БУЖАН, Л. БЭНДЭ, П. ГЛЕБКА, А. ДУДАР, М. ЗАРЭЦКІ, С. ЗНАЁМЫ, В. КАВАЛЬ, М. КЛІМКОВІЧ, А. КУЛЯШОЎ, Р. КОБЕЦ, К. КРАПІВА, Т. КЛЯШТОРНЫ, М. ЛЫНЬКОЎ, С. ЛІХАДЗІЕЎСКІ, А. ЛІПНЕВЫ, М. ЛУЖАНІН, Б. МІКУЛІЧ, М. МОДЭЛЬ, Р. МУРАШКА, М. НІКАНОВІЧ, Ул. СТЭЛЬМАХ, Ю. ТАЎБІН, М. ТЭЙФ, І. ХАРЫК, Ул. ХАДЫКА, М. ХВЕДАРОВІЧ, М. ЧАРОТ, К. ЧОРНЫ, С. ШУШКЕВІЧ.

ЦІШКА ГАРТНЫ

НОВАЯ ФАШЫСЦКАЯ РАСПРАВА

Фашысцкая Польшча судзіць тав. Тарашкевіча. Які ўжо раз правадыр беларускіх працоўных мас Заходняй Беларусі падпадае фашысцкай расправе? Ён доўгія гады знаходзіўся ў лапах разьюшанага польскага фашызму, які кідае яго з-пад судоў у турму і з вяспроду пад суд. Клясавая акупацыя ўстыдзіцца ня мае спагады. Асоба т. Тарашкевіча не дае спакою азьвярэлым акупантам.

Тарашкевіч, як старшыня стотысячнай Грамады, Тарашкевіч, як прадстаўнік працоўных мас у сойме, Тарашкевіч, як неўтамонны, пязьмірымы вораг буржуазнага ладу, акупацкага рэжыму.—Тарашкевіч небясьпечны для польскага фашызму. І фашыстоўшчына жорстка яго карае, трымае сваім заложнікам, сваёю ахвярою.

Польскі фашызм наступіў абцасам на Заходнюю Беларусь і ўсімі мерамі стараецца ня даць ёй падняцца. Яму трэба ближэйшы свой тыл спаралізаваць бязьдзеяньнем, абярнуць у могілкі. Экспансія на Ўсход—гэта маніякальная мара вялікіх польскіх фашыстаў, не шкадуе сустракаць сабе перашкоды.

І раптам тут пад носам. мільённыя масы беларускіх працоўных і іх правадыр—тав. Тарашкевіч.

Тарашкевіч, які ўпарта змагаецца супроць фашысцкай дыктатуры, Тарашкевіч, які сьмела і адважна кляйміць прыгнетацеляў-акупантаў, Тарашкевіч, які выкрывае ўсе жахі фашысцкай няволі перад беларускімі рабочымі і сялянамі з соймавай трыбуны, з вяковага экзэдры, з клюбнай эстрады.

Так. т. Тарашкевіч ня мог спакойна глядзець на расьпятую фашысцкай акупацыяй краіну, па якой гоцаюць карныя атрады дратун, сьвішчуць нагайкі і дымяцца пажары, дзе крывавыя каты ўваскрашаюць часы інквізіцыі, катуюць працоўных і спраўляюць оргіі расстрэлаў і шыбеніц.

Тав. Тарашкевіч няшчадна разьбіў усе манэўры і надзеі фашыстаў дабіцца пакоры і прымірэньня ад барацьбіта-рэвалюцыянэра.

З рэвалюцыйным пыевам і агідай заклеймёў тав. Тарашкевіч подлую прадажніцкую дзейнасьць беларускіх нацыянал-фашыстаў. З усёй сілай гнеўнага абурэньня і клясавай нянавісьці ён асудзіў прадажацыю з боку верных служак польскай фашыстоўшчыны розных Астроўскіх, Луцкевічаў, Акінчыцаў, Станкевічаў і да іх падобных—у адносінах да працоўных Заходняй Беларусі.

Тарашкевічу вядома, і ён пераконан у тым, што сыстэма вялту і зьдзекаў, экзэкуцый і палявых судоў, правакацый і подкупу—гэтых кітоў, на якіх трымаецца польская фашысцкая акупацкая ўлада—не пазбавіць ад пагібелі буржуазна-капіталістычны лад, не ўвекавечыць акупацыі Заходняй Беларусі, не адвядзе ад прыгнетацеляў грознае помсты працоўных.

Тав. Тарашкевіч не таіў гэтага ад сваіх катаў.

І за ўсё гэта польская фашыстоўшчына Тарашкевіча судзіць. І за ўсё гэта яна над ім учыняе сваю гнусную клясавую расправу. І за ўсё гэта дэфэнзыва ладзіць чарговую камэдыю суда над тав. Тарашкевічам.

Драпежнік заядла ўчапіўся кіпцюрамі ў сваю ахвяру.

Прэч катаў, дзікай, гнуснай расправы над адным з лепшых барацьбітоў за сацыяльна-нацыянальнае вызваленьне працоўных Заходняй Беларусі!

Вышэй магутны гарачы пратэст супроць фашысцкага суловага зьдзеку над тав. Тарашкевічам!

132 гады катаргі для рэвалюцыйных рабочых і сялян

ВІЛЬНЯ, 27. На днях у Навагрудку адбыўся палітычны працэс над 18 рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі па абвінавачаньні ў прыналежнасьці да КПЗБ. Акруговы суд прыгаварыў: **Яна Казака і Мікалая Сільвансвіча** па 15 гадоў катаргі кожнага з пазбаўленьнем правоў на 10 год.

8 чалавек прыгавораны на 7 год катаргі кожны, з пазбаўленьнем правоў па 10 год. Астатнія **8 чалавек—на 5 год катаргі.**

Засуджаныя на многія гады катаргі павінны апрача гэтага аплаціць яшчэ ўсе судовыя выдаткі ў суме 3.160 зл.

24 лістапада ў Горадзенскім акруговым судзе адбыўся працэс над **Веніямінам Катлерам,** з гор. Саколкі, **Рыгорам Ханецкім** з в. Плюскалаўцы, В.—Бераставіцкай гміны, і **Казімірам Сідаровічам** з м. Індура. Арыштаваныя абвінавачваюцца ў прыналежнасьці да КПЗБ і ў распаўсюджаньні камуністычнай літаратуры.

Акруговы суд прыгаварыў Веніяміна Катлера, Казіміра Сідаровіча і Рыгора Ханецкага на 2 гады катаргі кожнага.

Дзікі тэрор супроць бастуючых рабочых у Белавежы

ВАРШАВА, 26. «РОБОТНІК» паведамляе аб забастоўцы лясных рабочых Белавежскай пушчы, якая цягнецца паўтара месяца. ЗАБАСТОЎКА АДБЫВАЕЦЦА ВА ЎМОВАХ ДЗІКАГА ТЭРОРУ ПРАДПРЫЕМЦАЎ І ПАЛІЦЫІ. ШМАТ РАБОЧЫХ АРЫШТАВАНЫ. ЯНЫ ЗАКАВАНЫ Ў КАЙДАНЫ І ЖОРСТКА ЗЬБІВАЮЦЦА. Голад сярод рабочых і іх сем'яў набывае жудасныя разьмеры. Пад аховай паліцыі прыцягваюцца да работы ў ПРЫМУСОВЫМ ПАРАДКУ СЯЛЯНЕ З СУСЕДНІХ ВЁСАК.

Забастоўшчыкі дабіваюцца павышэньня жабрацкіх заработкаў, якія складаюць 80 ГРОШАЙ (17 КАП.) ЗА 8-ГАДЗІННЫ РАБОЧЫ ДЗЕНЬ і 1 ЗЛОТЫ 20 ГРОШАЙ (27 КАП) ЗА 12-ГАДЗІННЫ РАБОЧЫ ДЗЕНЬ.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

„Капітал" Маркса на беларускай мове

ПРЭЗЫДЫУМ БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК СТВАРЫЎ КАМІСІЮ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ 50-ГОДЗЬДЗЯ СА ДНЯ СЬМЕРЦІ КАРЛА МАРКСА, ЯКОЕ СПАЎНЯЕЦЦА 14 САКАВІКА 1933 ГОДУ. У КАМІСІЮ ЎВАЙШЛІ Т. Т. ДОМБАЛЬ, ШЧАРБАКОЎ, СУРТА, ЛЕВІН І КАРНЕЙКА.

НАМЯЧАЕЦЦА ПРАВЯДЗЕНЬНЕ РАДУ ПАПУЛЯРНЫХ ДАКЛАДАЎ АБ МАРКСЕ Ў ПРАМЫСЛОВЫХ ЦЭНТРАХ БССР. ДЛЯ ГЭТАЙ МЭТЫ МАБІЛІЗУЮЦЦА НАВУКОВЫЯ РАБОТНІКІ ІНСТЫТУТАЎ ФІЛЁЗОФІІ І ГІСТОРЫІ.

АДНАЧАСОВА ВЯДЗЕЦЦА РАБОТА ПА ПЕРАВОДУ 1-ГА ТОМУ «КАПІТАЛА» НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ. РЫХТУЕЦЦА ЗБОРНІК, ПРЫСЬВЕЧАНЫ К. МАРКСУ. У ЗБОРНІК УВОЙДУЦЬ АРТЫКУЛЫ І ВЫКАЗВАНЬНІ КАРЛА МАРКСА ПА ПЫТАНЬНЯХ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ, МОВЫ, РЭЛІГІІ І Г. Д.

У ДЗЕНЬ 50-ГОДЗЬДЗЯ АДБУДЗЕЦЦА ЎРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ АКАДЭМІІ НАВУК.

За культурны цэх

Трыкутнік дэпо Ворша за апошні час правёў вялікую работу па азэляненьні і прывядзеньні дэпо ў культурны стан. Замест замазучаных, заваленых сьмецьцем чорных дэпоўскіх шляхоў зьявіліся чыстыя, ярка жоўтыя насыпі. Вымыты і вычышчаны вокны і шыбы ва ўсім дэпо. Зроблена афарбоўка ўнутры памяшканьня мэханічных майстэрань. На вокнах пастаўлены вазоны.

Па ачыстцы і прывядзеньні дэпо ў культурны выгляд былі праведзены тры суботнікі, у якіх апрача паравозных і рамонтных брыгад прымалі ўдзел супрацоўнікі кіраўніцтва 3-га раёну.

ЦЯПЕР У ДЭПО ЁСЬЦЬ 4 КУЛЬТУРНЫЯ БРЫГАДЫ. АЎТАМАТНАЯ ўпрыгожана партрэтамі, на вокнах расстаўлены кветкі, у цэху пастаўлен стол для парторга, дзе ляжаць справачнікі і газэты. Памяшканьне ўтрымліваецца ў чыстаце. Мэханічны цэх таксама ўтрымліваецца ў такім-жа парадку. Кветкі, якія тут стаяць, паравозьнікі прынесьлі са сваіх кватэр. У прамывачнай станцыі ўсе сьцены і апараты пакрыты масьляной фарбаю.

За гэтымі першымі і другія цэхі і брыгады ўключаюцца ў барацьбу за чыстату, за культурны цэх. Ужо абвясьцілі сябе культурным цэхам інструментальны цэх

ХРОНІКА

* Дадаткова 339.000 руб. адпусьціла цэнтральнае кіраўніцтва сацыяльнага страхаваньня БССР для палепшэньня работы ясьляй, дзіцячых пляцовак і харчаваньня школьнікаў у чацьвертым квартале. З гэтай сумы 172.800 руб. выдзелена Віцебску, 70.750 руб. — Менску, 26.500 руб. — Гомелю, 20.000 руб. — фабрыцы «Дняпроўская мануфактура» і т. д.

* 15 школ, 12 калгасаў і саўгасаў, 5 цэнтняў ці ахопні час радыёфікаваны менскай майстэрняй ТПР. Канчаецца пабудова шэлікага радыё-вузла на заводзе «Камунар».

* Кіно-карціну «Заходні фронт» канчае лентараздая фабрыка. Ведзяржкіно да 15-гадовага юбілею Чырвонай армії. Фільм паказвае перапаўненае імпэрыялістычнай бойні ў грамадзянскую.

* Шахматна-шашачны турнір распачаўся на аршанскім чыгуначным вузле. У турніры прымаюць удзел звыш 30 чалавек з шахматна-шашачнай сэкцыі паравозьнікаў.

* За злоўжываньні і самазабесьпячэньне выключан з радоў партыі намесьнік загадчыка сталоўкі менскай электрастанцыі Пласкоў; загадчыку сталоўкі Ленпрэсу абвешчана суровая вымова з папярэджаньнем. Абодва зняты з работы.

* Да 13-й гадавіны выданьня дэкрэту Леніна аб ліквідацыі непісьменнасьці парада культработнікаў ФЗМК у Гомелі пастанавіла лабіцца стопрацантнага ахопу усіх непісьменных і малапісьменных гораду школамі ліквбезу.

* Агародны калгас «Акадэмія» арганізуецца на ініцыятыве БАН на вольных землях батанічнага саду. Для дапамогі ў арганізацыі калгасу Акадэмія выдала пазычку ў 5.000 руб.

* Пры ЦКК-НК РСІ БССР створана камісія пад старшынёю намесьніка наркома РСІ тав. Гурэвіча па скарачэньні і спрашчэньні апарату Наркамснабу. Да гэтай работы прыцягваецца шэф Наркамснабу — калектыў швейнай фабрыкі «Кастрычнік».

Паведамленьні

— ЦКК-РСІ Бел., газэта «Зьвязда» і Наркамфін БССР склікаюць нараду кіраўнікоў гаспадарчых аб'яднаньняў, якія плацяць падаткі і бюджэтныя пацэнкі ў бюджэт, і загадчыкаў-фінсэктароў па пытаньні выкананьня пляну плацяжоў у бюджэт па аграмаджаным сэктары.

Нарада адбудзецца 1-га сьнежня а 6 гадзіне ўвечары ў памяшканьні Наркамфіну БССР (другі паверх).

Яўка абавязковая.

ЦКК-РСІ,
«Зьвязда»,
Наркамфін БССР.

— Парткалегія ЦКК паведамляе, што 3-XII—32 г. у г. Гомелі будзе працаваць выязная ПТ ЦКК КП(б)Б па разгляду наступных спраў: Сілковіча Івана, Сілковіча Піліпа, Зладзеява (Дзятлаўскі р.-с., Гомельскага р-ну), Гергалова М. К., Ладнача Л. С., Казлова З. С., Ляпмана Т. А., Жывона В. Х., Лашука Ф. С., Пашкевіча М. М., Абразцова Г. А., Шклоўскага А. Г. Яўка пералічаных вышэй таварышоў абавязкова. Выкліканы таварышы павінны пры сабе мець характарыстыкі ад парт. яч. аб апошній сваёй працы.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ

УСІМ СТАРШЫНЯМ ГАРСАВЕТАЎ, РАЙВЫКАНКОМАЎ.

Праведзіцца на падставе ўрадавага распараджэньня

па 18 раёнах САПКАМПАНІЯ,

якая мае выключнае значэньне ў аздараўленьні конскага паголаўя ў ачышчэньні ад сапу, пастаўлена пад пагрозу зрыву з-за нежаданьня некаторых райвыканкомаў

адпусьціць вэтдактароў выехаць на 4 тыдні

ў раёны для правядзеньня гэтай работы.

ПРАПАНУЮ старшыням райвыканкомаў, гарсаветаў, кіраўнікам гаспадарчых арганізацый

безадкладна адкамандыраваць мабілізаваных на сапкампанію вэтдактароў

Забясьпечце безадкладнае выкананьне распараджэньня Наркамзему аб сапкампаніі.

Ясобнаўпаўнаважаны СНКБ па барацьбе з эпізотыямі—Наркамзямляробства

РАЧЫЦКІ.

ДОМ КАМАСЬВЕТЫ (былы клюб імя К. Маркса)

СЕНЬНЯ, адбудзецца

ВЯЛІКІ СЫМФАНІЧНЫ КАНЦЭРТ

ПРЫ ЎДЗЕЛЕ ВЯДОМАГА СКРЫПАЧА ВІРТУОЗА

Мірона ПАЛЯКІНА.

ПАЧАТАК у 9 гадзін веч. Білеты ў раб. касе і касе Дому Камасьветы.

Першы Дзяржаўны Тэатр (БДТ—1)

Сёньня Кузьма Чорны

БАЦЬКАЎШЧЫНА

Эпопея ў 4-х дзеях.

Пачатак у 8 гадзін вечара. Білеты ў раб. касе і касе тэатру.

Памяшканьне Польскага дзярж. тэатру Савецкая, 28 тэл. 15-20

БЕЛАРУСКІ РАБОЧЫ ТЭАТР ЦСПСБ.

Н. Федзін.

СЁНЬНЯ

ЧЫНГІЛЬБУД Пьеса ў 3-х актах

Пастаноўка В. Я. Галаўчынера.

Музыка С. Палонскага. Танцы Е. І. Вульф

Пачатак роўна ў 8 г. 30 м. Білеты ў касе тэатру з 12-2 і з 4-9 і ў рабочай касе з 12-2 і ад 4-6 гадз.

Па калектыўных заяўках—скідка.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА КАСА—ад 1 гадз.

Замежны матацыкл фільм штурман з „Прыбоя"

Драма ў 8 частках

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ Каса—ад 1 г. дня.

1) Мастацкі фільм Чалавек застаўся адзін

2) Кіно-хроніка Саюзкіно

Пралетары

Амэрыканская камэдыя ПАСЬПЕШНАЕ ВЯСЕЛЬЛЕ

Звыш праграмы—хроніка

Дзясяты дзіцячы сэанс ЗА ЧАЦЬВЕРТУЮ ЗЬМЕНУ

Кіно „СПАРТАК"

Ад 29 лістапада выдатны фільм

АРСЭНАЛ

Драма ў 7 частках.

Штодзенна 5 сэансаў.

Каса—з 1 гадз. дня.

Каса кіно—з Камсамольскай вул.

10-ты ДЗЯРЖЗЬВЯРЫНЕЦ

ПРЫБЫЎ НОВЫ ТРАНСПАРТ

жывёл і птушак.

Зьвярынец адкрыт з 9 гадз. раніцы да 11 гадз. вечара штодзенна.

Па калектыўных заяўках прадстаўляецца 50 проц. скідкі. Зварачацца ў кантору зьвярынцу загадзя

ТРЭСТУ БЕЛДЗЯРЖКІНО

ПАТРЭБНА

кваліфікаваная машыністка

НА СТАЛУЮ ПРАЦУ.

Зварачацца: Менск, Савецкая, 90 (2-гі паверх) у будынку к-т. „Чырв. Зорка".

Беларуская ф-ка Мэханізаванага лічэньня

пры кіраўніцтве народна-гаспадарчага ўліку БССР

працягвае НАБОР

на фабзавуч-брыгаду пры фабрыцы ў колькасьці 30 асоб для падрыхтоўкі аператараў па лічыльных і шчотна-вялізітычных машынах і статыстычных работнікаў.

Тэрмін навучаньня 4 месяцы.

Прымаюцца асобы, якія скончылі семігодку і маюць падрыхтоўку ў аб'ёме 7 груп.

Вучні забясьпечваюцца стыпэндыяй у разьмеры 50 руб. у месяц.

Інтэрнатам вучні не забясьпечваюцца.

Жадаючыя паступіць падаюць заявы з дакумантамі аб сацыяльным паходжаньні, адукацыі, годзе нараджэньні,—

не пазьней 5 сьнежня.

Заняткі 15 сьнежня.

Заявы падаваць асабіста ў цырэкцыю, рэг. Камуністычнай і Энгельса № 15

Дырэкцыя.

МЕНГАРПРАФСАВЕТ І МЕНГАРСТРАХКАСА

Сёньня, 29-11-32 г., у 7 гадзін вечара, у памяшканьні гарпрафсавету

склікаюць

ГАРАДЗКІ ЗЬЛЁТ усіх сац. бытавых сэктароў ФЗМК, загадчыкаў і тэхпрацаўнікоў выплатных страхавых пунктаў, загадчыкаў медпунктаў дзяржаных дактароў Менгарстрахкасы і страхактыву

па пытаньні аб барацьбе з прагуламі

ў рэдрэзе апошняй пастановы ЦВК і СНК СССР.

У сувязі з важнасьцю пытаньня прапануецца усім старшыням ФЗМК і загадчыкам выплатных пунктаў забясьпечыць 100 проц. явку.

Менгарпрафсавет
Менгарстрахкасе.

ЦЭНТРАЛЬНЫ ДОМ ТЭХНІКІ НКЛП і ЦК ЛКСМБ

(Камсамольская, 25)

АРГАНІЗАВАЎ

ЦЭНТРАЛЬНУЮ ТЭХНІЧНУЮ КАНСУЛЬТАЦЫЮ

для рабочых ударнікаў, вынаходцаў, рацыяналізатараў, ІТР, тэхпропаў, гаспадарнікаў і рабочых аўтараў,

Цэнтральная кансультацыя абслугоўвае сыстэмы Наркамлесправу і Наркамзяжпраму.

Кансультацыя правядзіцца ночная і завочная (шляхам лістоў), індывідуальная, групавая і масавая.

Кансультацыя правядзіцца станьне адыходаў: па лёгкай прамысловасьці, па вытворчасьцях: скура і абутак, шоўкавая вытворчасьць, хімічная, шклянная і выкарыстаньне—торф, мэталл-апрацоўчая прамысловасьць, будматар'ялы і энергэтыка.

Кансультацыя правядзіцца па пытаньнях: рабочага аўтарства, тэхнічнай бясьпечнасьці, арганізацыі тэхпрапаганды, методыцы тэхпрапаганды: тэхнічнай і юрыдычнай дапамогі вынаходцам і брызам, тэхбібліятэк тэхінфармацыі, аўтадарожнай справы, будаўніцтва і будматар'ялаў.

Па ніжэйпаказаных пытаньнях арганізаваны дзяжурствы:

№ № п.-ч.	ПЫТАНЬНІ	Месца	Даты	Час
1.	Тэхнічная і юрыдычная дапамога вынаходцам і брызам.	Габінэт Цэнтральнай кансультацыі.	1, 13, 25. 4. 14, 28.	Ад 7 да 8 г.
2.	Арганізацыя тэхбібліятэк тэхінфармацыі.	„	7, 10, 19, 22	„
3.	Аўтадарожная справа, кансульт. дарожны габінэт Аўтадарожнага камбінату Ц. Д. Т.	Габінэт Аўтадарожнай справы.	Штодзенна	Ад 7 да 9 г.
4.	Будаўніцтва і будматар'ялы.	Будаўнічая выстаўка ў ЦДТ	2, 5, 19, 14, 17, 20	Ад 7 да 8 г.

На кожнае пытаньне тэхнічнага характару, заданае у пісьмовым ці вусным выглядзе цэнтральная кансультацыя дае вычарпальны і дасканалы адказ.

Зат. кансультацыйным бюро прымае наведвальнікаў па 6, 12, 18, 24, 30, 31 ад 7 да 8 гадз. вечара і штодзенна ад 4 а пал. да 5 а пал. гадзін вечара.

Дырэкцыя ЦДТ.

1-га сьнежня, у 6 гадзін вечара,

у клюбе імя VII зьезду прафсаюзаў (б. Саўгандальслужачых) (рог Энгельса і Камуністычнай вул.)

адкрываецца

ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ

ПА ПЫТАНЬНЯХ

новых форм аплаты і тэхнармаваньня працы рахункова-статыстычных і іншых груп кіраўнічага апарату.

Пасяджэньне фракцыі там-жа ў 5 гадзін.

Бел. К-ра „СОЮЗОРГУЧЕТ".

Сёньня ў 7 гадзін вечара, у памяшканьні гарсавету (вялікая заля) адбудзецца

ЗЬЛЁТ ДЭПУТАТАЎ І СЭКЦЫЯНЭРАЎ МЕНГАРСАВЕТУ

ПАРАДАК ДНЯ:

1) Аб 2-месячніку паходу сэкцый дэпутацкіх груп у галіне вырабу тавараў шырокага спажываньня (дакладчык тав. Кіранёўскі).

2. Інфармацыя з месц ад фабрык, заводаў—дэпутацкія групы і члены савету: ад усіх арцеляў кіраўніцтва арцеляй аб выкананьні плянаў выробу тавараў шырокага спажываньня.

Яўка ўсіх дэпутатаў, сэкцыянэраў гарсавету і старшынь арцеляй абавязкова.

Аргмасавы аддзел Менгарсавету.

МЕНАДДЗЯЛЕНЬНЕ ДЗЯРЖБАНКУ

даводзіць да ведама, што з-за адсутнасьці крэдытаў

прадаюцца наступныя тавары: належачыя:

Ліставое жалезка	на 2.100 руб.		— Белдзяржлугтрэсту
Супэрфасфат	„ 3.900	„	
Негашаная вапна	на 2.416 руб.		— зав. буйна-блоч. каменьняў
Лясны матар'ял	„ 650	„	— Плодагародтрэсту
Кепі зімов., летнія	„ 74.000	„	— Белкаапрэмгандлю
Плугі	на 2.400	„	— Насеятрэсту.

АДМОВА АД АКЦЭПТАЎ.

Пчаліны мёд, варэньне сьлівачкае і бручка	на 3.000 р.		— Белплодагародпіна
Фанэра альховая, клён, доскі саск. і бэльки	на 5.800	„	— зав. „Дрэваапрац."
Шкіпінар	на 5.800	„	— арц. «Уперад»
Зап. часткі	„ 12.300	„	— Менк-ра Саюзтрэсту
Камуты звычайныя	„ 3.700	„	— Белсельгаснабу

Менаддзяленьне Дзяржбанку.

Менск, друкарня «Зьвязды». Галоўлітбел № 337.